ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 239 (3347) Пятніца, 18 кастрычніка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас ред. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, памкатар—619, кантора—781

ВАРШАВА, 17. Буржуазна-беларускі клюб сойму адпразіў у Лігу Нацый мемарандум аб эканамічным і палітычным становішчы беларусаў у Польшчы.

НАВІНЫ Б. С. С. Р.

Прывітаньне шэфу--газэце „Зьвязда“

Калгас імя газэты „Зьвязда“ у Гарачыцкім сельсавеце, Мазырскае акругі расьце шпаркім тэмпам. Зараз ён аб'яднае 122 гаспадаркі на плошчы 3,000 гэктараў. У дзень калектывізацыі агульны сход калгасу паслаў прывітаньне свайму шэфу—газэце „Зьвязда“.

Баявая гаспадарчая задача

Рад чарговых фінансава-гаспадарчых кампаній зварачае на сябе зараз нашу ўвагу. І гэта не выпадкова: першы квартал новага гаспадарчага году зьяўляецца кварталам баявым па выкананьні нашых агульных гаспадарчых плянаў. Неналежнае выкарыстаньне першага кварталу можа пахіснуць выкананьне гадавых заданьняў у розных галінах будаўніцтва. Вось чаму першы квартал патрабуе асабліва вялікай напружанай работы.

Асабліва напружаным першы квартал зьяўляецца ў адносінах выкананьня фінансавага пляну. Можна проста сказаць, што для асобных частак гэтага пляну першы квартал зьяўляецца рашаючым. Гэта становішча мае асабліва значэньне для ашчаднай справы ў адносінах уцягненьня сялянскіх зьберажэньняў.

Дзейнасьць ашчадных кас у апошні час значна ўзрасла. Ашчадныя касы сталі сапраўды важным каналам, які харчуе фінансаваньне народнае гаспадаркі. За апошні год касы ашчаднасьці БССР уцягнулі ў рэчышча дзяржкрэдыту звыш 5 мільёнаў руб., і астача капіталу ў іх на 1-е кастрычніка 1929 году складае 12,2 тыс. руб. Аднак, і гэта пашыраная дзейнасьць кас ашчаднасьці ніякім чынам ня можа задаволіць ужо цяпер нашых патрэбнасьцяй. Тэмп разьвіцьця кас ашчаднасьці адстае ад тэмпаў нашых «вялікіх работ». Гэты тэмп трэба яшчэ і яшчэ ўзмацніць.

Верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б даў па гэтым пытаньні канкрэтную дырэктыву:

«... п) Неабходна распрацаваць цэлы рад практычных мер па пашырэньні мабілізацыі дробных зьберажэньняў насельніцтва ў агульны дзяржаўны зварот як шляхам уцягненьня ўкладаў насельніцтва ў ашчадныя касы, так і шляхам больш энэргічнага распаўсюджаньня дзяржаўных пазык, асабліва сярод сялянства».

У адпаведнасьці з гэтай дырэктывай кантрольныя лічбы па ашчаднай справе на 1929-30 год прадугледжваюць патрэбнасьць уцягненьня ў ашчадныя касы БССР да 6 мільёнаў руб. і 140 тыс. новых укладчыкаў. Найбольшы цяжар выкананьня гэтых лічбаў падае на сялянскі сэктар і ў прыватнасьці—на першы квартал.

Згодна заданьня ўраду, у першым квартале павінна быць выканана 40 проц. гадавога заданьня па сялянскіх укладах. Для БССР гэта складае 600 тыс. руб.

Бязумоўная патрэбнасьць выкананьня гэтага заданьня, а разам з тым улік труднасьцяй гэтага выдзяляюць зараз асабліва вучастак ашчаднай справы на фоне нашых гаспадарчых кампаній першага кварталу. У адпаведнасьці з гэтым заданьнем трэба разгарнуць адпаведны тэмп работы па ашчаднай справе. На гэты тэмп павінна быць пераведзена работа самога ашчаднага апарату і таксама павінна быць аказана дапамога з боку партыйнай і савецкай грамадзкасьці. Асобныя кампаніі, якія праводзяцца зараз у вёсцы, ні ў якім выпадку не павінны ня толькі зацямніць заданьне па сялянскіх укладах у ашчадныя касы, але наадварот, яны павінны быць у максымальнай ступені ўвязаны з гэтым заданьнем. Гэта павінны ўсьвядоміць усе нашы сілы, якія кінуты зараз у вёску.

Трэба дабіцца максымальнай актыўнасьці з боку ашчаднай сеткі. Партыйныя арганізацыі павінны ўжыць меры да таго, каб забясьпечыць зараз адпаведнымі сіламі вучастак ашчаднае справы і паставіць на ногі вакол кватальнага заданьня ўсю мясцовую, асабліва вясковую грамадзкасьць. Асаблівую ролю ў практычнай рабоце па выкананьні заданьня павінна адыграць камсамольская арганізацыя. Вясковы камсамол павінен быць поўнасьцю выкарыстаны для ўцягненьня сялян у касы ашчаднасьці.

Апорнымі пунктамі пры паходзе ашчадных кас у вёску павінны служыць нашы саўгасы і калгасы. Калектывы гэтых гаспадарак павінны быць зачынішчыкамі ў справе папулярызацыі сярод сялянства калектыўнага мэтавага накапленьня праз ашчадныя касы і спушчыць прыкладам у гэтых адносінах для суседняга сялянства.

Заданьне па сялянскіх укладах у ашчадныя касы ўваходзіць непарыўнай часткай у агульны фінплян і, значыць, невыкананьне яго будзе мець непасрэдны ўплыў на ажыцьцяўленьне прадугледжаных гаспадарчых работ. Недабор у выкананьні заданьня па сялянскіх укладах у ашчадныя касы ў першым квартале зьявіцца недаборам у агульным гадавым гаспадарчым пляне. Гэта абавязвае да таго, каб неадкладна пашыраным фронтам узяцца за выкананьне гэтага заданьня.

Першы квартал павінен даць па БССР 600 тыс. руб. сялянскіх укладаў у касы ашчаднасьці.

Рашучыя мерапрыемствы хлебазагатоўчае кампаніі

У выніку хлебазагатоўчай кампаніі наўпа выявіліся яе асноўныя недахопы. Перш за ўсё няўменьне арганізаваць, якія прымаюць у ёй удзел, націскуць адначасова на ўсе вагары фінансавага, гаспадарчага і арганізацыйнага ўплыву. Выкарыстаньне тавараабесьпячэньня, мабілізацыя бядняцкіх і серадняцкіх мас, накіроўваньне ў вёску рабочых брыгад і рад іншых мерапрыемстваў праводзяцца з вялікай нярэгулярнасьцю: абавязкова што-небудзь адстае. Задачы хлебазагатоўчай кампаніі хоць і ўвязваюцца ў нашай агітацыі з агульнапалітычнымі і гаспадарчымі задачамі, але на практыцы ў гаспадарчых мерапрыемствах яны бяруцца ня ў вызначэньні, як гэта неабходна рабіць, а разрозьнена, без узаемнае сувязі. Між тым ключ да вырашэньня задач загатоўчай кампаніі іменна ў мэтазгоднай увязцы яе з агульнагаспадарчымі задачамі, а асабліва з работай па сацыялістычным перабудаваньні сельскай гаспадаркі. Там, дзе гэтай сувязі няма, самая лепшая агітацыя завісае ў паветры і не дае патрэбнага эфэкту. Гэту сувязь паміж хлебазагатоўчай кампаніяй і палітыкай партыі ў галіне індустрыялізацыі і калектывізацыі дасканала разумее кулак, які прабуе, як гэта відаць з сотняў прыкладаў, сарваць шляхам націску на хлебны рынак асноўны курс партыі.

Кулак ня толькі затрымлівае продаж хлеба, ён манэўруе, замяняючы жыта і пшаніцу фуражом і іншымі другарадным культурамі, а намерам стварыць для рабочае дзяржавы затрудненьні ў харчовым забесьпячэньні. Кулак прабуе ўзьдзейнічаць на заможную верхавінку вёскі, на няўстойлівыя элемэнты з асяродзішча серадняку, на паасобныя калгасы, якія дрэнна кіруюцца.

Мы б'ем кулака на важнейшых вучастках загатоўчага фронту, але кулак выкручваецца, прасьлізгвае ў той ці іншы бок з прычыны нярэгулярнага націсканьня на вагары ўзьдзейнічаньня.

Да вёскі яшчэ не даведзены патрэбныя прамтавары ў поўным асартымэнце. Адмоўны ўплыў гэтых недахопаў паглыбляецца дрэнным выкарыстоўваньнем фінансавых мерапрыемстваў і тавараабесьпячэньня ў якасьці зброі клясавае палітыкі. Кулак часта ёысьлізгвае ад тых ці іншых падатковых абавязацельстваў, кулак ухітраецца атрымаць дэфіцытныя тавары, ня выканаўшы цьвёрдых заданьняў па продажы хлеба і інш. Між тым пытаньне аб рашучай ліквідацыі кулацкага супраціўленьня зьяўляецца цэнтральным пунктам кампаніі.

У кастрычніку цьвёрдыя заданьні па продажы кулаком хлеба, перш за ўсё жыта і пшаніцы, павінны быць ва што-б там ні стала, бяз усякіх паслабленьняў, цалкам выкананы. У гэтых адносінах прыклад правільнага выкананьня сваіх абавязкаў перад рабочай дзяржавай павінен даць вёсцы сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі: саўгасы і калгасы. Таму зусім неабходна, каб у кастрычніку саўгасы і калгасы здалі цалкам, усе 100 проц., свае лішкі хлеба. І той калгас, які яшчэ дажынае хлеб, утойвае сапраўдны размер сваіх лішкаў, або прадае на бок, накшталт кулака і спакулянта, зрываючы кампанію, ня можа інакш разглядацца, як ілжэ-калгас.

У другую палову кастрычніка трэба значна ўзмацніць тэмп загатовак, націснуўшы асабліва на харчовыя культуры і на вырашэньне затрудненьняў транспарту і складаў. Трэба пачаць працаваць парэвалюцыйнаму. Толькі тады кастрычнік стане сапраўды рашаючым месяцам хлебазагатовак.

(«ПРАВДА»).

Ганебная расправа італьянскага фашызму

Па прыгавару суда адзін рабочы расстраляны і 4 засуджаны да 30 год зьняволеньня кожны

Адозва антыфашысцкага камітэту

Прыгавар па справе пяці рабочых

РЫМ, 16. Вынесены прыгавар па справе пяці рабочых. Абвінавачаны Ўладзімер Гартан прыгавораны да пакараньня сьмерцю. Астатнія 4-ра падсудных прыгавораны да турэмнага зьняволеньня на 30 год кожны. (ТАСС).

ПРЫСУД ГРУНТУЕЦЦА НА ПАДАЗРЭНЬНІ

РЫМ, 17. Агэнцтва «Стэфані» паведамляе, што Гартан расстраляны (рабочы, асуджаны на сьмерць па абвінавачаньні ў загаворы «на жыцьцё дзяржавы»).

Высьвятляецца наступная падрыбазнасьці справы 5 славенскіх рабочых, засуджаных спэцыяльным трыбуналам правінцы Поля. Абвінавачаньне, якое прыяло да расстрэлу аднаго з гадсудных і да турэмнага зьняволеньня рэшты падсудных на 30 гадоў, з юрыдычнага пункту погляду было пабудована самым ганебным чынам. Як сьцьвярджае акт абвінавачаньня, 24 сакавіка, у дзень выбараў у фашысцкі парлямант, у двух мясцовасьцях Істрыі, дзьве калёны выбаршчыкаў, якія накіроўваліся ў выбарчыя камісіі, былі абстраляны з суседніх лясоў. Двое выбаршчыкаў былі паранены, з якіх адзін пасьля памёр. «Адначасовасьць абодвух нападаў,—гаворыцца ў акце абвінавачаньня,—і палітычнае становішча, у абставінах якога былі ўчынены напады, адразу ўзбудзілі падазрэньне, што вінаватых належыць шукаць сярод славенскага насельніцтва, якое падбухторвалася эмісарамі нацыяналісцкіх арганізацый з таго боку граніцы. Не падлягае сумненьне, што замах на жыцьцё выбаршчыкаў у часе, калі тыя ішлі падаваць свой голас за фашысцкі рэжым, роўнаважна замаху на жыцьцё дзяржавы». Такім чынам акт абвінавачаньня выходзіць з простых падазрэньняў і ўвесь працэс быў яўна разьлічаны толькі на тое, каб тэрарызаваць славенскае насельніцтва Істрыі.

ФАШЫСТЫЯ АБУРАНЫ МІТЫНГАМІ ПРАТЭСТУ

РЫМ, 16. Камэнтуючы прыгавар спэцыяльнага трыбуналу па справе 5 славенцаў, з якіх адзін прыгавораны да кары сьмерцю, італьянскія газэты пратэстуюць супроць мітынгаў, якія склікаюць у Юга-Славіі ў сувязі з рухам пратэсту супроць гэтага працэсу. «Джорналь д'Італіі» піша, што прыгавар па справе 5 славенцаў «павінен зьявіцца папярджаньнем для ўдзельнікаў гэтае справы, якія знаходзяцца на тым баку мяжы».

Ахвяры фашыстых павінны быць выратаваны

БЭРЛІН, 15. Міжнародны анты-фашысцкі камітэт апублікаваў адозву да працоўных усіх краін з прычыны прысуду да пакараньня сьмерцю, які пагражае 5-ці рабочым Істрыі, адданым спэцыяльнаму трыбуналу па абвінавачаньні ў «змове супроць дзяржавы». Анты-фашысцкі камітэт заяўляе, што пяць нявінных ахвяр фашызму павінны быць выратаваны ў апошнюю хвіліну. Для гэтага трэба разьвіць шырокі рух пратэсту супроць фашысцкага тэрору. (ТАСС).

Бязьлітасна пакараць шкоднікаў сацыялістычнага будаўніцтва

У корані перасеч далейшыя вылазкі клясавага ворага

Рабочыя г. Менску—аб шкодніцтве на Аршанскім вузьле чыгункі

Паведамленьне аб вылазцы клясавага ворага на Аршанскім чыгуначным вузьле, надрукаванае ва ўчарайшым нумары газэты «Зьвязда», выклікала вялікае абурэньне рабочых гор. Менску. У горадзе і на Менскім вузьле чыгункі адбыліся сходы рабочых, на якіх былі вынесены рэзалюцыі з патрабаваньнем суровага пакараньня шкоднікаў, якія перашкаджаюць выкананьню пяцігадовага пляну.

***

Агульны сход **рабочых-чыгуначнікаў службы малага рамонту ст. Менск-пасажырская** адзначыў, што шкодніцкая дзейнасьць клясавага ворага на Аршанскім вузьле чыгункі зьяўляецца чарговай вылазкай контррэвалюцыйных элемэнтаў, якія прабуюць сарваць сацыялістычнае будаўніцтва.

Агульны сход асудзіў дзейнасьць кіруючых арганізацый вузла, якія, замест сапраўднага пралетарскага кіраўніцтва, зрывалі сацыялістычнае спаборніцтва і пляліся ў хвасьце адсталых рабочых. Агульны сход упэўнены, што асноўнае пралетарскае ядро чыгуначнікаў Аршанскага вузла ў корані спыніць вылазкі клясавага ворага.

Сход запэўніў партыю, што рабочыя прыкладуць усю энэргію да ажыцьцяўленьня працы ўдарных брыгад, да разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Сход патрабаваў прыцягненьня да суровай адказнасьці шкодных элемэнтаў і тэрміновага абсьледваньня органамі РСІ чыгуначнага транспарту.

***

Агульны сход **рабочых і служачых друкарні Белдзяржвыдавецтва**, заслухаўшы паведамленьне аб вылазцы клясавага ворага па Аршанскім вузьле, прызнаў, што гэта вылазка—спроба клясавага ворага сарваць сацыялістычнае спаборніцтва зрабіць уплыў на адсталыя, зьвязаныя з дробна-буржуазнымі элемэнтамі, групы рабочых. Падзеі на Аршанскім вузьле паказваюць, што контррэвалюцыйная работа шкоднікаў знаходзіць сабе глебу там, дзе дрэнна вядзецца прафэсыянальная і грамадзкая работа. Агульны сход заклікае ўсіх рабочых Аршанскага вузла павесьці рашучую барацьбу з клясавым ворагам. Асноўная задача рабочай клясы—дружная барацьба супроць клясавага ворага, за ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

***

Учора на сходзе шырокага прафактыву Менскага чыгуначнага вузла быў зачытаны артыкул аб шкодніцтве на Аршанскім чыгуначным вузьле. Сход адзначыў, што гэты факт зьяўляецца недапушчальным і заклікае ўсіх рабочых адносіцца з яшчэ большай увагай да свае працы і пільна сачыць за вылазкамі клясавага ворага, даючы кулацкім выступленьням рашучы адпор. Сход лічыць, што вінаватыя ў зрыве сацыялістычнага будаўніцтва павінны быць сурова пакараны.

У фашысцкай Польшчы

МАСАВЫЯ КАНФІСКАЦЫІ ДРУКУ

ВАРШАВА, 14. За апошнія дні канфіскацыі газэт, часопісяй і паасобных выданьняў прынялі масавы характар.

— У Катовіцах канфіскаваны: «Газэта Роботніча» за 8-га кастрычніка (за перадрук з кракаўскага «Наш-поду» артыкулу дэп. Мастка «Апошняя надзея»), «Кур'ер Сьлёнзкі», «Фольксвільле», «Кантовіцэр Цайтунг» і «Обэршлезішэр Кур'ер». («Раб.» 289).

— У Варшаве канфіскавана адозва Варшаўскага акругкому ППС аб «дні моладзі», адозва Варшаўскае арганізацыі пэпэсэаўскае моладзі і нумар пэпэсэаўскае газэты для вёскі «Хлопска Правда». («Раб.» 289).

— У Львове канфіскаваны пэпэсэаўскі «Дзеньнік Людовы» (за 11—X) за артыкул «Крымінальныя суб'екты прыймаюцца на працу ў касу хворых». Таксама канфіскаваны і нумар за 12 кастрычніка.

— У Чэнстахове канфіскавана тыднёўка ППС «Чэнстоховянін» за 13-га кастрычніка.

— У Варшаве 10 і 13 кастрычніка была ізноў канфіскавана пэпэсэаўская «Газэта Хлопска». Першы з гэтых нумароў быў канфіскаваны за артыкулы: «Няма законаў бяз згоды сойму», «Хто гэта пан Пышылоўскі» і «Як за караля Саса: еш, пі і разьбівай самаходы». Другі нумар быў канфіскаваны за артыкул: «Чаму вучыць гісторыя». («Раб.» 290).

— У Дамброве канфіскавачы пэпэсэаўскі «Глос Заглэмбія» (за 6—X) за артыкулы «Дзень рабочае моладзі» і «Загадкі».

— У Радаме канфіскавана тыднёўка ППС «Жыце роботнічэ» (за 13—X) за артыкул: «Забарона і цэнзура».

— «Новы Глос Пшэмыскі» (за 6—X) канфіскаваны за перадрук прамовы дэп. Лібэрмана ў Кракаве. Гэтай-ж тыднёўка канфіскавана і 13—X.

—Львоўскі «Дзеньнік Людовы» (за 13—X) канфіскаваны за перадрук з «Роботніка» рэзалюцыі саюзу чыгуначнікаў. («Раб.» 292).

ТАКСАМА „ПЯЦІГОДКА“

ВАРШАВА, 15. У сучасны момант у Варшаве з прычыны недахвату школьных будынкаў 10.000 дзяцей застаюцца без навучаньня ў пачатковай школе. Па падлічэньнях «рабочага таварыства прыхільнікаў дзяцей» лічба гэтая за 5 год павялічыцца да 45.000 дзяцей, бо Варшаўскі буржуазны магістрат не зварачае належнае ўвагі на будаўніцтва новых школаў, асабліва ў рабочых раёнах. («Раб.»).

Чырвонаармейскі ўдар па кітайскіх белабандытах

Як нашы часьці адбілі напад кітайскай ваеншчыны

(Начное радыё)

МАСКВА, 17. У сувязі з абстрэлам кітайскім войскам 12-га кастрычніка нашых суднаў на Амуры каля ракі Сунгары, ТАСС падае падрыбазнасьці гэтага нападу.

Пры падтрыманьні артылерыйскага агня кітайскае войскамела намер высадзіць дэсант на наш бераг. Аднак, чырвонаармейскія часьці, сумесна з нашай ваеннай флаціліяй, энэргічным контрудара мапракінулі кітайскі дэсант і прасьледвалі яго на кітайскі бераг, дзе нашы часьці, зламаўшы супраціўленьне ворага, разброілі кітайскія гарнізоны ў вёсцы Чычыа і крэпасьці Лахасусу.

Адначасова наша ваенная флаціля прымусіла замаўчаць кітайскую флацілію.

Пасьля гэтай апэрацыі нашы часьці ў той-жа дзень вярнуліся на савецкі бераг.

(Падрабязнасьці—у заўтрашнім нумары «Зьвязды»).

Міжнародная клясавая барацьба

Пленум ЦК КПЧ

Супроць фашызму—адзіным пралетарскім фронтам

ПРАГА, 10. 3-га і 4-га кастрычніка ў Празе адбыўся пашыраны пленум ЦК КПЧ, на якім абгаварваліся пытаньні, зьвязаныя з надыходзячымі парляманцкімі выбарамі, з 12-й гадавінай Кастрычнікавай рэвалюцыі і з унутраным становішчам партыі.

Дакладчык аб палітычным становішчы зазначаў на палітычнае значэньне надыходзячых выбараў, якія павінны зьявіцца новым крокам на шляху да фашысцкай канцэнтрацыі ўсіх буржуазных сіл і да новай імпэрыялістычнай вайны, лёза якое накіравана супроць СССР. Дакладчык адзначыў, што партыя павінна адказаць на мабілізацыю фашызму і сацыял-фашызму уцягненьнем рабочых мас у выбарчую барацьбу, мабілізацыяй прадпрыемстваў і іншым пралетарскім адзіным фронтам. Затым быў заслуханы даклад па пытаньні аб унутраным становішчы ў партыі. Па гэтым дакладзе была ўхвалена аднагалосна рэзалюцыя, якая канстатуе невыстарчальнасьць барацьбы з правай небясьпекай і прымірэнцтвам. (ТАСС).

Барацьба чэскіх гарнякоў разгортваецца

ПРАГА, 16. Барацьба гарнякоў Паўночна-Чэскага раёну за павышэньне зарплаты і супроць «рацыяналізацыі» разгортваецца. Выбухаюць стыхійныя забастоўкі. У панядзелак выбухнула стачка ў капальні «Анна Андрэ» з прычыны невырашэньня пытаньня аб начных зьменах. У той-ж дзень да забастоўкі далучылася яшчэ 13 капальняў. Усяго бастуе 6.000 рабочых. Бастуючыя далучыліся да плятформы, ухваленае канфэрэнцыямі чырвонага саюзу гарнякоў. Рэфармістыя забараняюць сваім членам прымаць удзел у забастоўцы. Рэфармістыя пераконваюць рабочых спыніць стачку, пагражаючы звальненьнем і пазбаўленьнем прафсаюзнае дапамогі па беспрацоўі. (ТАСС).

Спаборніцтва на ўзмацненьне працы камсамолу

БЭРЛІН, 16. У зьвязку з 10-цігодзьдзем існаваньня КІМ'у французскі камсамол выклікае нямецкі камсамол на спаборніцтва ў мэтах узмацненьня камсамольскай работы ў абедзьвюх краінах. (ТАСС).

Рабочыя заводу „Астра“ бастуюць 7-ы тыдзень

Пробы рэфармістых сарваць забастоўку

ВЕНА, 12. У Румыніі забастоўка больш двух тысяч рабочых вагонабудаўнічага заводу «Астра» ў Арадзе працягваецца ўжо 7-мы тыдзень. Забастоўка выбухнула ў сувязі з адмовай прадпрыемцаў павысіць зарплату на 30 проц. і ўстанавіць 8-мігадзінны рабочы дзень. У сувязі з тым, што ўнітарны прафсаюз, да якога належаць забастоўшчыкі, пастаўлен уладамі па-за законам, рэфармісцкі прафсаюз прабаваў уэўдзейнічаць на рабочых і ўтаварыць іх адмовіцца ад сваіх патрабаваньняў. Аднак, рабочыя працягваюць барацьбу, адхіліўшы пасрэдніцтва рэфармістых. Улады ўжываюць усе меры, каб сарваць забастоўку.

Забастоўка скончылася перамогай рабочых

СТАКГОЛЬМ, 16. 6-тыднёвая забастоўка аўтабусных шофэраў скончылася перамогай рабочых. Часткова задаволена патрабаваньне рабочых аб павышэньні зарплаты. Усе ўдзельнікі забастоўкі прыймаюцца зноў на работу. Прадпрыемцы пазбаўляюцца ў далейшым права звальняць рабочых без узгадненьня з прафсаюзам.

Пленум фінляндзкіх прафсаюзаў асудзіў правыя хістаньні

ГЭЛЬСЫНГФОРС, 16. Пленум міжсаюзнага аб'яднаньня фінляндзкіх прафсаюзаў, які адбыўся 14-га і 15-га кастрычніка, зьяўляецца важным этапам у фінскім рабочым руху. Пленум асудзіў правыя хістаньні некаторых членаў прэзыдыуму гэтага аб'яднаньня і выключыў іх з ліку прафсаюзаў. Пленум пастанавіў не пасылаць прадстаўніка ад фінскіх прафсаюзаў на Жэнэўскую канфэрэнцыю працы. Буржуазная і с.-д. прэса адэньвае пастановы пленуму, як «перамогу Масквы». (ТАСС).

Аўстрыйская кампартыя ачышчае свае рады ад правых элемэнтаў

ВЕНА, 12. Палітбюро аўстрыйскай кампартыі пастанавіла выключыць з партыі Шлампа, Рэйдынгэра, Клейна і Вавесьні за парушэньне партыйнай дысцыпліны і абарону варожых Камінтэрну пазыцый. Членам партыі Рысу і Прагану прапанавана не пазьней 17-га кастрычніка даць адказ на чатыры ўльтыматыўныя пытаньні ЦК аб іх адносінах да пастаноў 10-га пленуму Выканкому Камінтэрну, да барацьбы з правым ухілам, да чысткі партыі ад правых элемэнтаў, а таксама аб іх жаданьні абараняць гэтыя пастановы і выконваць іх на практыцы. (ТАСС).

Антыфашысцкі кангрэс Рурскае вобласьці

БЭРЛІН, 15. Ня гледзячы на забарону паліцыі, у ваколіцах Эсэна адбыўся анты-фашысцкі кангрэс Рурскай вобласьці. Прымала ўдзел звыш 300 дэлегатаў ад масавых пралетарскіх арганізацый, прадпрыемстваў, капальняў, спартыўных арганізацый і апазыцыйных працаўнікоў с.-д. саюзу Імпэрскага сьцягу. Паліцыі ўдалося разагнаць кангрэс толькі праз тры гадзіны пасьля таго, як ён пачаўся. (ТАСС).

Па Савецкім Саюзе

III надзвычайны зьезд саветаў Таджыкістану

ДЗЮШАМБЭ, 16. Учора вечарам адкрыўся III-ці надзвычайны зьезд саветаў Таджыкістану.

Старшыня ЦВК т. Мусратула-Максум, адкрываючы зьезд заявіў: «Разграміўшы басмачоў, Таджыкістан прыступіў да мірнага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. За апошнія тры гады адбудова рэспублікі ідзе шпаркім тэмпам. Стварыліся ўмовы для далейшага шпаркага разьвіцьця Таджыкскай рэспублікі. Прапоўныя Таджыкстану на шматлікіх сходах, зьездах і сходках вызказалі сваю волю аб узаходжаньні ў Савецкі Саюз у якасьці самастойнай саюзнай рэспублікі. Мы ўпэўнены, што стварэньне саюзнай рэспублікі пад кіраўніцтвам саюзнага пралетарыяту яшчэ больш узмоцніць гаспадарчы і культурны рост рэспублікі і павысіць добрабыт працоўных мас. Наш зьезд зьяўляецца сапраўды гістарычным. **Мы ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы здолеем абярнуць Таджыкістан у магутную базу культуры бавоўны, перабудаваць сельскую гаспадарку на сацыялістычных пачатках і дабіцца яшчэ больш буйных посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва».**

Абраны прэзыдыум зьезду з 74 чал. Пад бурныя воплескі абраны ганаровы прэзыдыум у складзе т. т. **Сталіна, Молатава, Калініна, Рудзутака, Рыкава, Варашылава, Енукідзе і Зеленскага.**

Урадам Таджыкістану атрыманы шматлікія прывітаньні.

Напярэдадні адкрыцьця зьезду ў Дзюшамбэ прыбыў чырвоны абоз хлеба з горных кішлакаў. Горцы-дэхкане прывезьлі звыш 80 тон хлеба.

КЕРЧАНСКІ РАЁН НАДАЕЦЦА ДА ЗАСЕВУ БАВОЎНЫ

СІМФЭРОПАЛЬ, 17. Праведзеныя ў бягучым годзе засевы бавоўны ў Керчанскім раёне паказалі поўную магчымасьць і выгаднасьць культываваньня гэтае культуры ў раёне. Ураджай сыр-ду складае ад 4 да 7 цэнтнараў на гэктар. У наступным годзе «Главхлопкомам» вызначаны для засеву і кантрактацыі ў Керчанскім раёне 2.000 гэктараў бавоўны. Арганізуюцца бавоўняныя засеўныя т-вы. Сеяць бавоўну будуць і ў іншых раёнах Крыма.

Прыём у вайсковыя лётныя школы

МАСКВА, 16. Асоавіяхім СССР прыступіў да вярбоўкі слухачоў у вайсковыя лётныя школы. Чарговы набор у клясу лётнікаў вайскова-паветраных школ РСЧА адбудзецца ў сьнежні г. г., а вайскова-адборачныя камісіі правядуць іспыты кандыдатаў з 1-га па 15-га сьнежня. У першую чаргу прыймаюцца рабочыя, батракі, беднякі, члены ЎсеЛКСМ і ЎсеКП(б). (ТАСС).

ДА АДЧЫНЕНЬНЯ ТУРКЕСТАНА-СІБІРСКАЕ ЧЫГУНКІ

МАСКВА, 16. У некаторай частцы Туркестана-Сібірская чыгунка пачала функцыянаваць. Гэта акалічнасьць дарком абавязаў Народны камісарыят шляхоў зносін забясьпечыць падрыхтоўкі. Для БССР гэта складае 600 тыс. руб.

Вада на Няве ідзе на спад

ЛЕНІНГРАД, 16. Вада на Няве ідзе на спад. Заводы, якія знаходзяцца ў паласе затапленьня, працуюць. Пашкоджаньні, зробленыя вадой, наогул нязначныя. Дзякуючы ўжытым мерам, лік чалавечых ахвяр нязначны. Трое загінулі разам з баржай на Няве, адзін пажарны ўтапіўся пры выкананьні свайго абавязку. Небясьпека пакуль прайшла, але неабходны непаслабны нагляд за стыхіяй у далейшым.

ЛЕНІНГРАДЗКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ЗЬНІЖАЕ САБЕКОШТ НА 95 МЛН. РУБЛ.

ЛЕНІНГРАД, 16. Камісія ВСНГ РСФСР па праверцы зьніжэньня сабекошту ў Ленінградзе прыступіла да працы. Пачалася праверка па мэталяпрамысловасьці Хэмтрэсту, Ленжэту, Ленсельпраму, Прамтрэсту і Юмтрэсту. Камісіяй устаноўлена, што ў бягучым апэрацыйным годзе Ленінградзкая прамысловасьць мясцовага і рэспубліканскага значэньня павінна зьнізіць сабекошт на 95 млн. рублёў супроць 46,8 мільёнаў рублёў, паводле пляну за мінулы год.

Закрыцьцё маскоўскага абласнога зьезду ЛКСМ

МАСКВА, 16. Закрыўся першы маскоўскі абласны зьезд камсамолу. На заключным пасяджэньні з прывітальнай прамовай выступіў тав. **Варашылаў**, якога спаткалі доўгімі авацыямі. Пасьля заключнага слова т. Чмаданава, зьезд заслухаў паведамленьне загадчыка АПА МК УсеЛКСМ т. Худзякова аб прыняцьці шэфства маскоўскай абласной арганізацыяй камсамолу над злучэньнямі лінейных карабляў Балтыйскага фэйк

23.917 трактараў

ЭКАНА РСФСР зацьвердзіла паданчі НКЗ плян разьмеркаваньня трактараў, якія вызначаюцца па РСФСР на 1929-30 год. Агулам для сельскай гаспадаркі ўсяго Саюзу прадбачана на 1929-30 год 23.917 трактараў, супроць 9.350, якія адпушчаны ў мінулым годзе. Гэта азначае павялічэньне трактарнага забесьпячэньня амаль у 3 разы. З гэтай колькасьці РСФСР будзе выдана 7.159 трактараў, пры чым ужо да вазмай кампаніі вывезена на месцы 1.195 трактараў. Трактарны парк РСФСР нагогул падвойваецца. Усе трактары, якія даюцца РСФСР, разьмяркованы ў сав. гасп. цэнтры калгасам, трактарным калёнам, ільна-саўгасам і г. д. Разьмеркаваньне па раёнах будзе праведзена асобна. З прычыны напружанасьці работ на лесараспрацоўках, якая выклікана павялічэньнем праграмы лясное прамысловасьці, ЭКАНА РСФСР прызнала неабходным павялічыць забесьпячэньне трактарамі і лясное прамысловасьці і ўзьняла халайніцтва па гэтым пытаньні перад Саветам працы і абароны. Паўночна-Каўкаскаму крайвыканкому прапанавана пры разьмеркаваньні трактараў унутры краю ў першую чаргу забясьпечыць запатрабаваньні Кубанскага цукровага заводу.

Кангрэс славянскіх філёлёгаў у Празе

Прцоўныя Украіны і Беларусі, дзякуючы савецкай уладзе, атрымалі магчымасьць вольнага нацыянальна-культурнага разьвіцьця

МАСКВА, 16. У Празе на кангрэсе славянскіх філёлёгаў, акадэмік Студзінскі, выступаючы з прывітаньнем ад імя навуковага т-ва імя Шаўчэнкі, у заключнай частцы сваёй прамовы сказаў: «Сёньня мы стаімо перад усім славянствам з вынікамі нашай навуковай работы. Няхай паўтары тысячы друкарскіх аркушаў, якія штогод Усеукраінская акадэмія навук у Кіеве выдае, сьведчаць аб нашай рабоце. Мы верым, што настане час, калі сярод славян ужо ня будзе больш падзяленьня на вольных і прыгнечаных, а будуць вольныя славянскія народы».

Прадстаўнік літаратуразнаўцаў УССР **Піпенко** ў сваёй прамове, закранаючы пытаньне аб чэска-украінскіх узаемадносінах, адзначыў, што раней нацыянальна-рэвалюцыйны рух Украіны натмага папулярнага паэты Украіны Шаўчэнкі. Цяпер у Савецкай Украіне 30-ці-мільённая большасьць украінскага народу карыстаецца паўнейшаю свабодаю культурна-нацыянальнага разьвіцьця.

Ад імя Беларускай акадэміі навук праф. **Бузук** выказаў сваю радасьць з прычыны таго, што ён можа выступаць тут на мове 10-мільённага беларускага народу, якая раней лічылася правінцыяльным дыялектам «адзінай і непадзельнай» расійскай мовы, а зараз, дзякуючы Савецкай уладзе, атрымаўшы поўную магчымасьць разьвіцьця, якая скора зойме належнае месца сярод славянскіх моваў. Закранаючы агульныя задачы кангрэсу, праф. **Бузук** сказаў: «не для прапаганды ідэі панславізму сабраліся мы сюды. Прысутнасьць дэлегатаў Францыі, Італіі, Нямеччыны і

Кітайская буржуазія распраўляецца з савецкімі грамадзянамі

1.300 зьняволеных галадуюць

ТОКІЁ, 16. Паводле вестак з Харбіна ад 15-га кастрычніка, галадоўка 1.300 зьняволеных у Сумбэйскім лягеры савецкіх грамадзян працягваецца трэці дзень. Зьняволеныя патрабуюць: 1) прад'яўленьня абвінавачаньня; 2) вызваленьня ўсіх тых, да каго абвінавачаньне ня будзе прад'яўлена, у асаблівасьці жанчын; 3) устанаўленьня ня турэмнага, а лятэрнага рэжыму, сучасны-ж рэжым нават горшы ад турэмнага, бо арыштаваным забаронена чытаць, памяшканьні не апаляюцца і не асьвятляюцца, а таксама забаронены бачаньні з сваякамі. Галадоўка абвешчана на тры дні, аднак, калі адміністрацыя лягеру ня зробіць ніякіх зьмен у рэжыме, галадоўка будзе працягвацца. Зьняволеныя зьвярнуліся да нямецкага генэральнага консула Штобэ з просьбаю наведаць лягер.

ПАГАЛОЎНАЕ ЗВАЛЬНЕНЬНЕ САВЕЦКІХ ПАДДАНЫХ З ЧЫГУНКІ

ТОКІЁ, 16. Як паведамляюць з Харбіна, мае адбыцца пагалоўнае звальненьне ўсіх савецкіх служачых К.-У чыгункі, якія ня зволіліся самі, ці ня зволены да гэтага часу кітайскай уладай, калі яны не пажадаюць перайсьці ў кітай

КАНДЫДАТЫ Ў ПАРТЫЮ

Вытворчыя ячэйкі — Падрыхтоўвайце новыя кадры перадавых рабочых і работніц для ўступленьня ў КП(б)Б. Узмацняйце палітычнае выхаваньне рабочага актыву. Выяўляйце кандыдатаў у партыю—рабочых ад варштату, сапраўды перадавых пралетараў.

Перадавых пралетараў у паатыю

Посьпехі вярбоўкі ў партыю лепшых перадавых рабочых ад варштату залежаць ад пастаноўкі масавай работы на прадпрыемствах. Практыка паказала, што рост партыі за лік перадавых рабочых ідзе нармальна і пасьпяхова там, дзе партыйная арганізацыя здолела наладзіць сыстэматычную культурна-асьветную і палітыка-выхаваўчую работу і штодзенна выяўляе кадры для росту.

На кожным заводзе, на кожнай фабрыцы ёсьць пэўныя кадры перадавых таварышоў, якія могуць стаяць у авангардзе рабочай клясы, якія могуць і павінны знаходзіцца ў радах КП(б)Б. Патрэбна толькі належная зацікаўленасьць партарганізацый да пытаньняў росту, патрэбны чулы, уважлівы падыход, каб наша КП(б)Б абагацілася новымі кадрамі перадавых, адданых партыі рабочых.

На жаль, ня ўсюды ячэйкі КП(б)Б удзяляюць належную ўвагу рабоце па вярбоўцы ў партыю. Ня ўсюды ячэйкі ўяўляюць гэта пытаньне з масавай работай сярод рабочых. Трэба сказаць адкрыта, што масавая работа не разгорнута ў належнай меры на большасьці прадпрыемстваў. Слабасьць масавай работы на жаль—масавая хвароба ў партыйных ячэйках, «ахілесава пята» работы вытворчых парткалектываў. Ячэйкі не навучыліся яшчэ пасапраўднаму выяўляць кадры для росту, пасапраўднаму прыцягваць іх да партыі.

На заводзе «Дрэвааапрацоўшчык» з 270 рабочых і работніц амаль $^2/_3$ маюць шматгадовы вытворчы стаж. Сярод гэтых кадраў ёсьць шмат перадавых, адданых сацыялістычнаму будаўніцтву таварышоў. Між тым гэтыя кадры на сёньняшні дзень яшчэ не ў радах КП(б)Б.

Лепшыя рабочыя на вытворчасьці, якія ў штодзённай рабоце агітуюць за разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, рабочыя вынаходцы, найбольш адданыя партыі таварышы, дагэтуль яшчэ ня ўцягнуты ў партыю. Прычыны? —Неахайнасьць з боку ячэйкі, слабое разгортваньне масавай работы, наўважныя адносіны да пытаньняў росту.

Вось для прыкладу некалькі таварышоў, перадавых рабочых заводу, якія яшчэ не ў радах КП(б)Б.

Тав. **Рубінштэйн**—столяр зборачнага цэху, вытворчы стаж—15 гадоў, актыўнейшы рабочы. Тав. Рубінштэйн выконвае на заводзе цэлы рад грамадзкіх нагрузак. Ён член заўкому, вытворчай камісіі, РКК. Тав. Рубінштэйн карыстаецца вялікім аўтарытэтам на заводзе.

Тав. **Рыўнін**—столяр зборачнага цэху, вытворчы стаж—25 гадоў. Тав. Рыўкін актыўна ўдзельнічае ў грамадзкім і вытворчым жыцьці заводу, працуе ў ячэйцы Асоавіяхіму, карыстаецца аўтарытэтам сярод рабочых.

Тав. **Зайцаў**—майстар ляковачнага цэху, мае шматгадовы вытворчы стаж, член вытворчай камісіі, член кваліфікацыйнай камісіі. Тав. Зайцаў атрымаў прэмію за некалькі ўдасканаленьняў працэсаў работы на заводзе.

Тав. **Рантоўскі**—пілаточ лесапільнага цэху, вытворчы стаж—15 гадоў, член вытворчай камісіі. Тав. Рантоўскі—высокакваліфікаваны рабочы, актыўна ўдзельнічае ў грамадзкім жыцьці заводу, карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод рабочых.

Тав. **Лазоўскі**—добры працаўнік на вытворчасьці, сьвядомы, адданы партыі рабочы.

Тав. **Мясіла**—гатаршчык, вытворчы стаж—30 гадоў, член вытворчай камісіі, прыкладны і дысцыплінаваны рабочы.

Тав. **Лютарэвіч**—стругальшчык, добры, вытрыманы рабочы, актывісты Аўтадору.

Гэты сьпіс можна працягнуць, але мы думаем, што гэта зробіць на практыцы сама ячэйка КП(б)Б «Дрэвааапрацоўшчыка», якая павінна прылажыць усе намаганьні, каб завербаваць у партыю ўсіх блізкіх ёй перадавых рабочых заводу.

С. Г—н.

ТЭМП УЗМАЦНІЦЬ

Палітычнае выхаваньне рабочых — баявая задача ячэйкі

(ЯЧЭЙКА КП(б)Б ЭЛЬВОДУ)

На Эльводзе (Менск) працуе 155 рабочых - мэталістаў, з якіх каля 100 чал. маюць 15-25-гадовы вытворчы стаж. Партыйная праслойка на прадпрыемстве складае 38 проц. Гэта лічба сьведчыць аб тым, што ячэйка прарабіла вялікую работу па ўцягненьні перадавых рабочых у рады партыі.

Але гэта ня значыць, што парт'ячэйка Эльводу ня мае недахватаў у вярбоўцы новых кадраў. На Эльводзе працуе каля 100 беспартыйных рабочых, сярод якіх ёсьць вытрыманыя перадавыя таварышы. Яны праводзяць грамадзкую работу, актыўна ўдзельнічаюць у гаспадарча-палітычных кампаніях, змагаюцца за ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны і дапамагаюць партыйнай ячэйцы ў выхаваньні рабочых.

Сярод гэтых перадавых рабочых парт'ячэйка слаба праводзіць індывідуальную агітацыю і невыстарчальна вярбуе іх у рады партыі.

Тэмп росту ячэйкі за апошні час зьнізіўся. За першы квартал ячэйка ўцягнула ў партыю толькі аднаго рабочага. За другі квартал гэта лічба павялічылася на 6 чал. У трэцім квартале тэмп росту зноў пашоў на зьніжэньне. Ячэйка толькі адзін раз паставіла пытаньне аб росьце. Былі ўхвалены адпаведныя пастановы, якія, на жаль, на практыцы ячэйка не ажыцьцявіла.

У пляне ячэйкі пытаньне аб росьце яе не знайшло адбітку. Гэты дробны факт лішні раз сьведчыць аб тым, што ўвага ячэйкі да вярбоўкі рабочых у партыю за апошні час зьменшылася.

Асобныя камуністыя праводзяць індывідуальную агітацыю сярод некаторых беспартыйных рабочых. Вынікі гэтае работы паказваюць, што беспартыйныя рабочыя праяўляюць вялікую зацікаўленасьць да важнейшых пытаньняў і задач партыі. Але ячэйка не праводзіць гэтага мерапрыемства ў шырокім маштабе, і таму большая частка рабочых не азнаёмлена з палітычнымі пытаньнямі і задачамі бягучага моманту. Ячэйка не папулярызавала сярод рабочых пастаноў XII зьезду КП(б)Б і 16-й партканфэрэнцыі. Старыя беспартыйныя рабочыя ня ўцягнуты ў работу палітшкол і гурткоў. Палітвучобай ахоплена толькі 14 беспартыйных рабочых. Тэмп росту ячэйкі за лік камсамольцаў, рабочых ад варштату, таксама невыстарчальны. На Эльводзе ёсьць шмат старых камсамольцаў, якія маюць вялікі вытворчы стаж і праводзяць актыўную грамадзкую і прафэсыянальную работу.

Парт'ячэйка не вядзе пастаяннай сыстэматычнай работы па падрыхтоўцы гэтых камсамольцаў да перадачы ў партыю.

Масавая культурна - выхаваўчая работа на прадпрыемстве не разгорнута. Ячэйка праводзіць няцікавыя даклады, ад выпадку да выпадку праводзяцца гутаркі і г. д. Але штодзеннага выхаваньня рабочых няма. Гэта зьяўляецца асноўнай перашкодай росту ячэйкі. База для росту ёсьць. Дзесяткі старых рабочых мэталістых—перадавікоў сацыялістычнага спаборніцтва, якія працуюць на Эльводзе, павінны быць уцягнуты ў партыю. Трэба толькі разгарнуць шырокую выхаваўчую работу, трэба палепшыць палітычнае выхаваньне рабочых кадраў.

А. Н.

АД РЭДАКЦЫІ

Даючы ў першы раз аддзел «КАНДЫДАТЫ Ў ПАРТЫЮ», рэдакцыя «Зьвязды» спадзяецца, што гэтае не пачынаньне сустрэне водгук з боку парткалектываў нашых фабрык і заводаў і з боку рабочых калектываў наогул.

Справа вярбоўкі ў партыю лепшых адданых сацыялістычнаму будаўніцтву рабочых — важнейшая работа вытворчых ячэек.

Газэта можа і павінна дапамагчы гэтай рабоце. Адна ўмова тут патрэбна, каб рабочыя як партыйцы, так і беспартыйныя, пісалі ў газэту аб кандыдатах у партыю, як аб тых, што публікуюцца газэтай, так і аб новых, якія, па думцы рабкора, заснаванай на агульнай думцы рабочага калектыву, сапраўды зьяўляюцца вартымі ўступіць у рады бальшавіцкай партыі.

Рэдакцыя чакае гэтых водгукаў і лістоў.

Нявычэрпныя рэзэрвы

(Гарбарня „Бальшавік")

Рост партыі за лік перадавых рабочых—баявая і неадкладная задача партыйных арганізацый. Мы па старонках «Зьвязды» ня раз адзначалі, што буйнейшыя вытворчыя парткалектывы заводаў і фабрык Беларусі нерашуча, не з належнай увагай падыходзяць да вярбоўкі лепшых рабочых і работніц у партыю.

За апошнія гады мы маем бурны рост рабочага актыву на вытворчасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва і іншыя палітычныя кампаніі высунулі ў рады актыву новыя сотні і тысячы рабочых і работніц, адданых сацыялістычнаму будаўніцтву. У партыю павінна быць уцягнута ўсё лепшае з гэтых кадраў рабочага актыву, усё лепшае з рабочае клясы.

Для выкананьня гэтае задачы мы павінны палепшыць культурна-масавую работу на прадпрыемствах, узьняць якасьць групавой і індывідуальнай палітычнай агітацыі, значна больш уцягнуць рабочы актыў у штодзенную партыйную і грамадзкую работу. Між тым факты з практыкі асобных заводзкіх і фабрычных парткалектываў сыгналізуюць аб тым, што на гэтым адказным палітычным вучастку партыйнае работы ёсьць пэўныя недахопы.

Сапраўды, ці праводзіцца на фабрыках і заводах у належнай меры штодзенная пастаянная вярбоўка ў партыю перадавых пралетарскіх кадраў? На жаль, мы павінны адзначыць, што многія вытворчыя парткалектывы не праводзяць гэтае работы і ня бачаць ніякіх пэрспэктыў для свайго росту. Сярод асобных вытворчых партарганізацый распаўсюджана думка аб тым, што ўжо ўсе лепшыя і перадавыя рабочыя ад варштату завербаваны ў партыю.

І таму гэтыя арганізацыі не праводзяць агітацыйнай работы сярод рабочых і работніц, ня ўцягваюць лепшых з іх у рады партыі. У сапраўднасьці-ж у радох рабочых калектываў ёсьць магутныя рэзэрвы для росту партыі, ёсьць вялікія кадры сапраўдных пралетараў-інтэрнацыяналістых, адданых партыі, гатовых змагацца за пасьпяховае правядзеньне нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Для прыкладу возьмем гарбарню «Бальшавік». На «Бальшавіку» працуе каля тысячы рабочых і работніц, сярод якіх ёсьць сотні старых рабочых, якія дзесяткі год працуюць на вытворчасьці. Звыш трохсот рабочых і работніц «Бальшавіка» актыўна ўдзельнічаюць у вытворчым і грамадзкім жыцьці заводу. Дзесяткі рабочых і работніц ідуць у авангардзе сацыялістычнага спаборніцтва і паказваюць у сваёй штодзённай рабоце прыклад вялікага творчага энтузіязму і клясавай сьвядомасьці. Дэлегацкія сходы згрупавалі вакол сябе вялікія кадры беспартыйных работніц, якія шчыра ўдзельнічаюць у правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній і актыўна выконваюць вытворчую грамадзкую нагрузку. Па пэхах і аддзяленьнях праводзяць вялікую прафэсыянальна-грамадзкую работу энтузіясты камсамольцы, якія зьяўляюцца першымі пачынальнікамі і ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва на гарбарні. Гэтыя нявычэрпныя рэзэрвы зьяўляюцца лепшай крыніцай для росту заводзкага парткалектыву.

Між тым рост партыйнага клектыву праходзіць марудна і невыстарчальна. За апошні год у партыю прынята прыкладна 40-50 рабочых, большасьць якіх мае невялікі вытворчы стаж. Парткалектыў і пэхавыя ячэйкі фармальна падыйшлі да вярбоўкі рабочых і работніц. Групавая і індывідуальная арапоўка заняпала. Пэх'ячэйкі не праводзяць штодзённай агітацыйна-палітычнай работы па наближэньні і падрыхтоўцы перадавых кадраў рабочага актыву да ўступленьня ў партыю. Прапагандысцкая работа ячэек не прыстасавана да задач партыі па ўзмацненьні тэмпу вярбоўкі. На гарбарні выдаецца шматтыражная газэта «Рабочае Вока». Газэта згрупавала вакол сябе дзесяткі актыўных рабкораў і рабкорак. Па нашай думцы, старонкі «Рабочага Вока» зьяўляюцца лепшым сродкам для выяўленьня перадавых рабочых гарбарні і наближэньня іх да партыі. Але газэта гэтага ня робіць. «Рабочае Вока» не выяўляла рабочых і работніц, якія ідуць у першых радох сацыялістычнага спаборніцтва і якія могуць і павінны быць у партыі. Газэта павінна выправіць гэты вялікі недахоп.

Бюро асобных цэх'ячэек упэўнены, што ўсе магчымасьці для росту ўжо выкарыстаны і больш няма каго ўцягваць у партыю. А між тым у цэхах ёсьць дзесяткі перадавых рабочых і работніц. Так, у хромавым цэху старыя рабочыя зьяўляюцца прыкладнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага спаборніцтва і праводзяць на ўласнай ініцыятыве агітацыю сярод новых маладых кадраў рабочых за павялічэньне прадукцыйнасьці працы і паляпшэньне якасьці прадукцыі.

Вось, напрыклад, тав. **Гальнік**. Ён працуе на вытворчасьці звыш 20 год. Актыўна працуе ў вытворчай камісіі і цэхавай РКК. Заўсёды агітуе рабочых і работніц за ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве. Сам тав. Гальнік зьяўляецца прыкладным рабочым, за ўвесь час ён не зрабіў ні аднаго прагулу. Сярод рабочага калектыву тав. Гальнік карыстаецца вялікім аўтарытэтам.

Работніца хромавага цэху, тав. **Нахамава**, праводзіць грамадзкую работу і зьяўляецца членам гарсавету. На вытворчасьці тав. Нахамава зарэкамэндавала сябе прыкладной і перадавой работніцай. Тав. Нахамава мае вялікі вытворчы стаж.

Рабочы **Запольскі** працуе больш за 15 год на вытворчасьці і выконвае адказную прафэсыянальна-грамадзкую нагрузку. Ён зьяўляецца членам ЦП саюзу гарбароў, членам заводзкага камітэту і вытворчай камісіі. Тав. Запольскі актыўна ўдзельнічае ў сацыялістычным спаборніцтве і праводзіць агітацыйную работу сярод рабочых цэху.

Такіх таварышоў на заводзе ёсьць дзесяткі. Яны няпрыкметна штодзенна і сыстэматычна праводзяць вялікую вытворча-выхаваўчую работу па ўцягваньні рабочых да ўдзелу ў гаспадарча-палітычных кампаніях і ў грамадзкім жыцьці заводу. Яны праводзяць відавочную адказную работу па выхаваньні новых кадраў рабочых. Зразумела, што гэтыя актывістыя-рабочыя павінны быць у партыі, бо яны сваёй штодзённай работай даказалі сваю адданасьць партыі і жаданьне актыўна ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве.

Заводзкі парткалектыў павінен выяўляць гэтыя кадры і ўцягваць іх у КП(б)Б.

Ул. ЭЛЬ.

Пленум сэкцыі навуковых працаўнікоў БССР

Пэрспэктывы навага навучальнага году

На пленуме сэкцыі навуковых працаўнікоў БССР нам. Наркамасьветы тав. **Слонім** зрабіў даклад аб пэрспэктывах новага навучальнага году.

Тав. Слонім спачатку звярнуў увагу пленуму на тое, што па Беларусі сёлета ня выкананы ўстаноўлены процант прыёму рабочых у ВНУ. Не запоўнена таксама і сялянская курыя. Прычынай гэтага зьяўляецца тое, што мы прымаем у ВНУ на базе сямігодкі і што асобы, якія паступаюць па сялянскай курыі, слаба забясьпечваюцца.

На працягу пяцігодкі Наркамасьветы разарганізуе і пашырыць сетку рабфакаў. Гэтае мерапрыемства будзе садзейнічаць камплектаваньню ВНУ пралетарскім элемэнтам. Акрамя таго, прымаюцца меры да лепшага забясьпечаньня сялянскай курыі. Між іншым ужо сёлета адкрываюцца курсы для падрыхтоўкі асоб, якія паступаюць па сялянскай курыі.

Сыстэма асьветы ў БССР будзе перабудавана з такім разьлікам, каб наблізіць яе да задач, якія пастаўлены перад намі пяцігодкай у галіне рэканструкцыі народнае гаспадаркі.

Сёлета мы зварочваем шмат увагі на пашырэньне тэхнічнай асьветы ў БССР. У Гомелі будзе арганізавана вышэйшая тэхнічная навучальная ўстанова з 6-ю факультэтамі.

Якасьць прадукцыі нашых ВНУ нас не задавальняе. Яны выпускаюць малакваліфікаваных спэцыялістых. Бязупынная вытворчая практыка заклікана змагацца з гэтым недахопам. У нас, праўда, не хапае сродкаў для ажыцьцяўленьня бязупыннай вытворчай практыкі, але мы ўсё-ж яе ўвядзем.

Нашы ВНУ маюць шмат дасягненьняў у галіне беларусізацыі, але яны нас здаволіць ня могуць, бо заданьне ў гэтай галіне далёка яшчэ ня выканана. Трэба таксама вывярнуць увагу на якасны бок беларусізацыі. Наркамасьветы патрабуе ад усіх ВНУ канкрэтных пляноў і вызначэньня тэрмінаў беларусізацыі ўсіх сваіх супрацаўнікоў. Мы будзем правяраць, як гэтыя пляны выконваюцца.

Наркамасьветы прымае рашучыя захады да павялічэньня асьпірантуры. Ён зараз павялічыў у тры разы колькасьць асьпірантаў у беларускіх ВНУ, але цяжка падабраць належныя кадры кандыдатаў, бо пытаньне пастаўлены было вельмі позна. Каб палепшыць якасьць асьпірантуры, найлепшыя з асьпірантаў будуць пасылацца для ўдасканаленьня ў саюзныя навуковыя ўстановы ў Маскву. Некалькі асьпірантаў Наркамасьветы думае пакіраваць заграніцу.

Асноўную ўвагу Наркамасьветы ўдзеліць умацаваньню марксыцкіх кадраў ВНУ.

Фінансавыя магчымасьці для ажыцьцяўленьня ўсяго гэтага, бязумоўна палепшыліся. Бюджэт Наркамасьветы ўзрос на 32 проц. Стыпэндыі студэнтам павялічаны да 45 руб., а сярэдні заработак навуковага працаўніка ўзрос на 16 проц.

Гэта ня значыць, аднак, што фінансавае становішча дазваляе нам выкінуць намечаныя мерапрыемствы без асаблівай напружанасьці. Мы, праўда, атрымалі больш грошай, але наша работа ўскладнілася: у ВНУ стварэцца больш сэкцый, ухілаў, а гэта ўсё патрабуе грошай.

Выступаўшыя ў спрэчках адзначалі рад недахопаў у рабоце Наркамасьветы як чыста-практычных, так і арганізацыйнага парадку. Заўважалася, што ўсё-ж такі вельмі мала зроблена ў галіне падрыхтоўкі асьпірантуры, сыстэма асьветы не дапасавана да задач рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, няма падручнікаў ня толькі для вышэйшых, а і для сярэдніх школ, вельмі дрэнна стаіць справа з вучэбнай плошчай, адзін з факультэтаў беларускай акадэміі навук перайменаваны ў факультэт калектывізацыі, але ён усё-ж не перабудаваны і г. д.

Рашучай самакрытыкай выкрыем усе недахопы і перашкоды ў рабоце насьценгазэт

Перавыбары рэдкалегій павінны прайсьці як масавая палітычная кампанія.—Посьпех яе цалкам залежыць ад падрыхтоўкі.—Кіраўніцтва насьценгазэтамі павінна стаць арганічнай часткай работы парт'ячэек

Рыхтуйся да перавыбараў рэдкалегій насьценгазэт

У лістападзе месяцы гэтага году па ўсёй Беларусі будзе праводзіцца справаздачна-перавыбарчая кампанія рэдкалегій насьценных і друкаваных (фабзаводзкіх) газэт.

У гэтым годзе справаздачна-перавыбарчая кампанія набывае асабліва важнае палітычнае значэньне.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна прайсьці, як масавая палітычная кампанія, пад непасрэдным кіраўніцтвам мясцовых партыйных арганізацый, пры актыўнай дапамозе усіх грамадзкіх арганізацый.

Асноўнымі задачамі нашага нізавога друку зьяўляюцца: мабілізаваць шырокія масы працоўных вакол ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі па выкананьні вялізарнага пяцігадовага пляну сацыялістычнай рэканструкцыі нашае гаспадаркі; праз разгортваньне самакрытыкі змагацца з правым ухілам у тэорыі і на практыцы, змагацца з «левымі» наскокамі на партыю, з рэцыдывамі трацкізму; рашуча выкрываць усе спробы клясавага ворага сарваць наша сацыялістычнае наступленьне ў горадзе і вёсцы; уцягнуць усю рабочую масу і бяднацка-серадняцкія пласты вёскі ў сацыялістычнае спаборніцтва па зьніжэньні сабекошту прадукцыі, павышэньні яе якасьці, паляпшэньні дзяржаўнага апарату, па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі; дапамагчы партыі ў чыстцы яе радоў, у чыстцы і ўзмацненьні дзяржаўнага апарату.

Перавыбарчая кампанія павінна паказаць, як нізавы друк спраўляецца са сваімі задачамі, наколькі работа насьценгазэт адпавядае задачам партыі, наколькі насьценгазэты разгортваюць самакрытыку, «ня гледзячы на асобы».

У часе перавыбараў павінна выявіцца, як партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі дапамагаюць і кіруюць рабселькораўскім рухам, як яны прыслухоўваюцца і скарыстоўваюць насьценгазэты ў сваёй практычнай рабоце, як сродак уплыву на масы. Перавыбарчая кампанія павінна паслужыць для далейшага паляпшэньня кіраўніцтва нізавым друкам з боку партыйных арганізацый, якія павінны разглядаць кіраўніцтва насьценгазэтамі, як арганічную частку партыйнай работы.

У гэтым годзе ўпяршыню пасьля справаздачнага дакладу рэдкалегіі ставіцца судаклад заводакіраўніцтва (ва ўстановах — адміністрацыі, у вёсцы—сельсавету) аб выкананьні прапаноў па рабселькораўскіх заметках.

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал яшчэ да разгортваньня кампаніі павінен праверыць свае адносіны да газэты, ролю газэты ў вытворчасьці, якія канкрэтныя дасягненьні мае прадпрыемства ў выніку работы газэты.

Посьпех кампаніі будзе цалкам залежаць ад падрыхтоўкі да яе. Трэба зараз-жа ўсім партыйным арганізацыям, усім рэдкалегіям насьценгазэт прыступіць да падрыхтоўчай работы.

Справаздачы і перавыбары рэдкалегіі павінны прайсьці пад знакам рашучай самакрытыкі ўсёй працы насьценгазэты, пад лёзунгам праверкі работы насьценгазэты з пункту погляду ажыцьцяўленьня насьценгазэтай на практычнай рабоце пастаноў IV усесаюзнай нарады рабселькораў.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна папоўніць рады рабселькораў дзесяткамі тысяч новых рабселькораў.

Пры саміх перавыбарах трэба забясьпечыць поўную выбарчасьць рэдкалегій, выбраўшы ў склад рэдкалегій сумленных, адданых партыі і савецкай уладзе працаздольных таварышоў.

ВЕРЖБАЛОВІЧ.

Згодна пастановы Сакратарыяту ЦК КП б)Б ад 14 кастрычніка 1929 г. на справаздачна-перавыбарчых сходах рэдкалегій насьценгазэт заводакіраўніцтвы (ва ўстановах—адміністрацыі, у вёсцы—сельсаветы) павінны зрабіць судаклады аб выкананьні прапаноў па рабселькораўскіх заметках.

Як падрыхтавацца да справаздачна-перавыбарчага сходу

Ад сваячасовай і добрай падрыхтоўкі да перавыбараў залежыць і посьпех справаздачна - перавыбарчай кампаніі. Кожная рэдкалегія, кожны рабселькор павінен гэта ўсьвядоміць. Неадкладна трэба ўзяцца за падрыхтоўчую працу.

Перш за ўсё трэба на кожным прадпрыемстве, установе, або вёсцы скласьці цьвёрды каляндарны плян правядзеньня кампаніі. Для папулярызацыі кампаніі трэба скарыстоўваць усякія сходы рабочых (сялян), дзе рабіць інфармацыі аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Па буйных цэхах у абедзенныя перапынкі правесьці з рабочымі гутаркі аб рабоце газэты, яе дасягненьнях і недахватах, уважліва прыслухоўвацца да заўваг і прапаноў рабочых на далейшы час працы газэты. На фабрыцы, у ленкутках, клюбах і хатахчытальнях разьвесіць лёзунгі і плякаты з адпаведным зьместам.

Потым трэба ўмовіцца з партыйнымі, камсамольскімі і прафэсыянальнымі арганізацыямі аб пастаноўцы на іх пасяджэньнях дакладаў рэдкалегіі.

У чарговых нумарох насьценгазэты трэба шырока асьвятляць работу насьценгазэты за справаздачны пэрыяд, зьмясьціць водгукі рабочых аб рабоце насьценгазэты, завесьці ў газэце спэцыяльны аддзел прапаноў на далейшы час работы насьценгазэты.

Да перавыбарчага сходу пажадана зрабіць выстаўку апошніх нумароў насьценгазэты.

Справаздача рэдкалегіі і прапановы на далейшы час павінны падрыхтоўвацца на пашыраным пасяджэньні рэдкалегіі разам з рабкорамі і камісіяй ад парт'ячэйкі, якая праводзіла абсьледваньне работы насьценгазэты.

Дзень, калі будзе праводзіцца справаздачна-перавыбарчы сход, павінен быць падабраны з такім разьлікам, каб у гэты дзень на прадпрыемстве ня было ніякіх іншых сходаў і нарад. Аб гэтым трэба наперад умовіцца з партыйнай ячэйкай і фабкомам.

Справаздача і перавыбарчы сход павінны праводзіцца на агульным сходзе чытачоў, інакш кажучы, на агульным сходзе ўсіх рабочых і служачых.

Трэба праз рабкораў і іншымі шляхамі (аб якіх сказана ў пачатку артыкулу) стварыць грамадзкую думку вакол важнасьці справаздачна-перавыбарчага сходу, трэба зацікавіць рабочых, каб забясьпечыць максымальную яўку на перавыбарчы сход.

На сходзе павінны быць пастаўлены наступныя пытаньні: а) справаздача рэдкалегіі аб рабоце насьценгазэты і суддаклады камісіі па абсьледваньні насьценгазэты і адміністрацыі заводу або ўстановы (у вёсцы сельсавету) аб выкананьні прапаноў па рабселькораўскіх заметках.

Там, дзе рэдкалегія была нядаўна (улетку) выбрана і склад яе падабраны працаздольны, перавыбараў рабіць ня трэба, а абмежавацца толькі справаздачай рэдкалегіі.

Справаздачны даклад трэба пабудаваць такім чынам, каб ён аллюстроўваў у сабе дасягненьні газэты, недахваты яе і прапановы па паляпшэньні ўсёй рабселькораўскай работы на прадпрыемстве, установе або вёсцы.

У справаздачным дакладзе трэба асабліва вызьліць пытаньні, як газэта растлумачвала генэральную лінію партыі, як яна мабілізавала ўвагу шырокіх мас працоўных вакол чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва, як яна змагалася з праявамі правага ўхілу і прымірэнцтва да яго, які ўдзел прыняла газэта і рабселькоры ў сацыялістычным спаборніцтве і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Узьнімем якасьць фабзавадзкіх газэт

Адна з лепшых

На гарбарні «Бальшавік» (Менск) другі год выходзіць друкаваная двухтыднёвая газэта рабочых **«Рабочае Вока»**. Газэта заслугоўвае выключнае ўвагі.

За зусім кароткі тэрмін свайго існаваньня, газэта стала ў першыя рады фабрычна-заводзкага друку. «Рабочае Вока» зьяўляецца аднэй з лепшых друкаваных газэт у Беларусі. Адным з дадатных бакоў «Рабочага Вока» трэба адзначыць разьлік усяго матар'ялу на радавога рабочага. Мова газэты простая і зразумелая. Радавы рабочы заводу ў поўнай меры можа разабрацца і зразумець тыя пытаньні, якія ўзьнімае газэта. «Рабочае Вока» пазбаўлена хваробы многіх іншых фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт — капіяваньня цэнтральных газэт, бяручы ўпор на асьвятленьне жыцьця і работы свайго заводу.

Асьвятляючы задачы тэй ці іншай палітычнай кампаніі, «Рабочае Вока» заўсёды гэтыя задачы пралямляла ва ўмовах свайго прадпрыемства. Вакол газэты аб'яднана звыш 100 рабкораў, якія ня толькі пішуць у газэту, але і зьяўляюцца найбольш прыкладнымі рабочымі на прадпрыемстве. Сярод рабкораў праводзіцца сыстэматычная выхаваўчая работа. Дзякуючы належнай працы з рабкорамі газэта моцна зьвязалася з апошнімі, што значна палягчае работу рэдкалегіі. Усе працэсы вытворчага жыцьця, культработы, праца грамадзкіх арганізацый, вучоба, барацьба з недахватамі на прадпрыемстве, рацыяналізацыя і інш. маюць поўны адбітак на старонках газэты.

Газэта добра ілюструецца фота-здымкамі (пры газэце ёсьць фота-гурток, у якім працуе каля 40 рабочых). З знадворнага боку газэта прыгожая і вабіць да сябе чытача.

«Рабочае Вока» дабілася таго, што на кожную заметку, якая ўносіць што-небудзь новае або падкрэсьлівае тыя ці іншыя недахваты на прадпрыемстве—адказвае адміністрацыя. Адказы адміністрацыі або іншых органаў, якіх датычыць справа, зьмяшчаюцца амаль у кожным нумары газэты. Такім чынам, рабкор бачыць, што зроблена па яго заметцы.

Сацыялістычнаму спаборніцтву газэта, як і належыць, аддала выключную ўвагу. Газэта зьявілася фактычным арганізатарам спаборніцтва гарбарні «Бальшавік», паставіўшы перад рабочымі канкрэтную задачу ўступленьня ў сацыялістычнае спаборніцтва. Цэлыя старонкі некалькіх нумароў былі прысьвечаны асьвятленьню практыкі іншых заводаў і фабрык і растлумачэньню сярод рабочых задач сацыялістычнага спаборніцтва. Газэта ня толькі прапагандавала сацспаборніцтва, але і арганізоўвала яго і рашуча біла і б'е па недахватах у вытворчасьці, адначасова паказваючы дасягненьні і станоўчыя бакі работы на гарбарні.

Ня раз газэта рашуча выступала супроць асоб, якія ня толькі не жадалі прымаць удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве, але імкнуліся распаўсюдзіць свой уплыў і на іншых рабочых.

З галоўных недахватаў газэты трэба адзначыць тое, што яна не займалася пытаньнямі вярбоўкі перадавых рабочых у партыю. Зусім мала асьвятляла жыцьцё і работу парткалектыву. Зусім слаба пастаўлена справа беларусізацыі газэты. Спадзяемся, што гэтыя недахваты газэта пры дапамозе сваіх рабкораў у бліжэйшы час выправіць. Наогул трэба сказаць, што газэта баявая, мае вялікі каштоўны вопыт, які іншыя фабрычна-заводзкія друкаваныя і насьценныя газэты павінны скарыстаць.

Ул. СТРЫГОЦКІ.

„Пляцецца ў хвасьце"

(Чырвоная акулярніца № 8)

Друкаваная газэта рабочых фабрыкі акуляраў (Віцебск) выходзіць адзін раз у месяц. Гэта асноўны недахоп. Пры такім выхадзе газэта траціць сваю сьвежасьць і ня можа быць надзейнай. Рабкор Маліноўскі ў сваім артыкуле правільна высоўвае пытаньне аб неабходнасьці выхаду газэты ня менш 2-х раз у месяц. Трэба будзе рэдкалегіі яго прапанову правесьці ў жыцьцё.

Зараз аб самім зьмесьце газэты. Папершае, адразу кідаецца ў вочы, што газэта ня масавая. Стварэцца ўражаньне, што ў газэту пішуць, галоўным чынам, члены рэдкалегіі і «штатныя» рабкоры. Другое—гэта тое, што газэта нават пры сваім штомесячным выхадзе моцна адстае ад жыцьця—«пляцецца ў хвасьце». Газэта зьмясьціла вялікую колькасьць пастарэлых нататак, як: **«Результаты работы по соцсоревнованию за июнь месяц»**, **«Как профактив участвует в соцсоревновании»** (апошняя нататка адносіцца да жніўня месяца), **«Конкурс на лучшего рабочего оправдал»** (у той час, калі конкурс скончыўся 15-га чэрвеня), **«Больше внимания пионерам»**—аб акруговым зьлёце піянэраў, які адбыўся ў жніўні і рад іншых заметак.

Ня гледзячы на тое, што нумар прысьвечаны гадавому юбілею газэты, рэдкалегія абмежавалася зьмяшчаньнем толькі аднаго агульнага артыкулу Я. Кантаровіча, у якім канстатуецца, «што друкаваньне газэты сябе апраўдала», але няма ні слова аб практычных дасягненьнях газэты. Лічыць дасягненьнем, што «чытачом газэты зьяўляецца амаль што кожны рабочы і служачы» пры дармовай раздачы газэты, наўрад ці можна.

У той час, як зараз газэты галоўным чынам павінны ўдзяляць увагу асьвятленьню ходу сацыялістычнага спаборніцтва, мабілізаваць шырокія масы вакол сацспаборніцтва, газэта зьмяшчае толькі 4 артыкулы (дый тыя ўжо пастарэлі) інфармацыйнага парадку. Газэта прахадзіць міма палітычнага значэньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Рэдакцыйны артыкул «Задачи комсомола» напісаны вельмі агульна і ніякай карысьці ў рабоце камсамольскай ячэйкі не прынясе.

Трэба адзначыць зусім правільную пастаноўку ў артыкуле рабкоркі Царапінай пытаньня аб рабоце вылучэнцаў, у якім паказваецца аб няправільным скарыстаньні на вытворчасьці вылучэнцаў—памочнікаў інструктароў.

Як добры бок у газэце, трэба адзначыць зьмяшчэньне артыкулу «Трудовой копейкой поможем бедняку», у якім рабочы В. Скварцоў расказвае аб рабоце рамонтнай брыгады ў падшэфнай вёсцы.

У канцы нельга абыйсьці міма слабой пастаноўкі беларусізацыі. Акрамя рэдакцыйнага артыкулу, усе заметкі зьмешчаны на расійскай мове.

Рэдкалегіі трэба будзе ўлічыць усе адзначаныя недахопы і пастарацца ў бліжэйшы час іх зьнішчыць.

В.

Пра беларусізацыю забыліся

Газэта «Ротация» — орган рабочых і служачых друкарні «Палесдрук» (Гомель). Тыраж газэты 500 экзэмпляраў.

Апошні нумар газэты (78) ад 25 верасьня прысьвечаны сацыялістычнаму спаборніцтву і чыстцы парт'ячэйкі. Рэшта матар'ялу (зусім нязначная частка) прысьвечана розным пытаньням.

Праглядаючы газэту «Ротация» нельга ня спыніцца на некаторых яе адмоўных бакох. Перш за ўсё ў газэце зьмешчаны вялікія і сухаватыя артыкулы, у якіх сустракаецца шмат роўналежнасьці, агульных разважаньняў, непатрэбных сказаў. Усё гэта надае газэце сухаватасьць.

Матар'ял аб сацспаборніцтве раскіданы па ўсіх чатырох старонках. Зьмешчана матар'ялу па сацспаборніцтве шмат, але большая частка казённага, інфармацыйнага. А на справе, што роб

Прафсаюзы слаба удзельнічаюць у хлебазагатоўчай кампаніі

Жывое кіраўніцтва падменьваецца фармальнымі цыркулярамі

Ці перайшлі ўжо прафсаюзы на новыя формы работы?

Прэзыдыум УсеЦСПС у сваёй рэзалюцыі аб рабоце прафорганаў Беларусі адзначыў, што «прафсаюзы БССР яшчэ не дасягнулі неабходнага пералому ў сэнсе сапраўднае зьмены зьместу і мэтадаў сваёй штодзённай работы ў адпаведнасьці з асаблівасьцямі рэспублікі і задачамі прафруху ў рэканструкцыйным пэрыядзе».

З часу апублікаваньня гэтае рэзалюцыі прайшло больш за два месяцы. Натуральна, важна вызначыць, у якой меры прафорганы Беларусі ўцямілі новыя формы і мэтады работы.

Хлебазагатоўкі — адна з такіх кампаній, якая павінна гэта паказаць. Хлебазагатоўкі — экзамэн, які прафорганы прымаюць перад партыяй і рабочай клясай, экзамэн на кіраўніцтва прафсаюзнымі масамі, на ўдзел у палітычным і гаспадарчым жыцьці краіны.

Паглядзім, як нашы беларускія прафсаюзы спраўляюцца з гэтай задачай.

Сапраўднае кіраўніцтва зноў замяняецца абежнікамі

Саюз саўгандальслужачых врабіў вельмі «шмат». У пачатку кампаніі ён абсьледаваў ступень падрыхтоўкі Белкаапсаюзу. Абсьледваньне выявіла, што Белкаапсаюз яшчэ нават не прыступіў да падрыхтоўкі. Тады ЦП саюзу абурылася і вынесла суровую і вялікую рэзалюцыю, у якой прапанавала Белкаапсаюзу рад мерапрыемстваў для ажыўленьня хлебазагатовак. І на гэтым ЦП саюзу саўгандальслужачых супакоілася.

Зараз, калі ставіш пытаньне перад работнікамі ЦП, што яны зрабілі для хлебазагатоўчай кампаніі, яны з гонарам адказваюць:

— О, мы далі вельмі суровыя дырэктывы Белкаапсаюзу... Паглядзеце, колькі мы прапаноў напісалі ў рэзалюцыі...

— А можа вы ведаеце, як Белкаапсаюз выканаў вашы прапановы?

— Э... мы... мы... гэтага ня ведаем... Трэба было-б праверыць...

Так, дарагія таварышы, трэба было, даўно трэба. Ні для каго не сакрэт, што, атрымаўшы вялікую і суровую рэзалюцыю ЦП саюзу аб хлебазагатоўках, праўленьне Белкаапсаюзу парашыла адпачыць і амаль у поўным складзе разьехалася ў чарговы водпуск. Нават працаўнік, які кіруе хлебазагатоўкамі, таксама паехаў у адпачынак, не пакінуўшы нават намесьніка. Зразумела, што ніякай падрыхтоўчай работы да хлебазагатовак як у самым Белкаапсаюзе, так і на мясцох праведзена ня было.

Вось вам «выкананьне» суровай і вялікай рэзалюцыі ЦП саюзу саўгандальслужачых.

Аб гэтым у мясцовых газэтах былі вымешчаны адпаведныя заметкі. **Як на гэта рэагавала ЦП саюзу?** Ды ніяк. Мы нават ня ведаем, ці чытаў хто-небудзь з працаўнікоў ЦП саюзу гэтыя заметкі.

„Узмацніць... пашырыць... паглыбіць...“

І наогул, як рэагуе ЦП саюзу саўгандальслужачых на вялікую колькасьць абураючых фактаў злачынных і нядбайных адносін хлебазагатоўчых арганізацый да сваіх абавязкаў, аб чым штодзенна паведамляе наш друк? Зноў такі, ніяк.

Вось паведамляюць з Гомельскай акругі. Там верасьнёўскі плян хлебазагатовак выкананы толькі на 36 проц. Асноўная прычына — бязьдзейнасьць загатоўчага апарату. Наглядаюцца прымірэнчыя адносіны часткі загатоўшчыкаў і сельсаветаў да заможных гаспадарак. Саюзхлеб слаба кіруе сваімі кантралёрамі і ў выніку млынары ўхіляюцца ад здачы памольнага збору. Многія сяляне-кантрактанты вывозяць свой хлеб на рынак, а прапаўнікі сельгаскаапэрацыі спакойна наглядаюць за тым, як кантрактанты варочаюць уязныя раней грошы. Адчуваецца вялікі недахват прамтавараў. Яшчэ ня зжыта канкурэнцыя паміж загатоўшчыкамі.

Здаецца, што ўсе гэтыя злачынныя адносіны загатоўшчыкаў да загатоўкі хлеба **павінны былі выклікаць хвалю пратэстаў з боку прафсаюзных органаў і адпаведныя арганізацыйныя вывады.** Але, як паведамляе Гомельскі карэспандэнт, прафсаюзныя арганізацыі стаяць у баку, прафсаюзы нічога не зрабілі для ўзмацненьня тэмпу хлебазагатовак, **у тым ліку і Гомельскае аддзяленьне саюзу саўгандальслужачых.**

Як-жа на гэта рэагавала ЦП саюзу саўгандальслужачых? Таксама, як і ў выпадку з Белкаапсаюзам, **г. зн., ніяк.**

Выбачайце, у пачатку кампаніі ЦП саюзу саўгандальслужачых разаслала мясцом абежнік, у якім шмат раз паўтаралася — «узмацніць... пашырыць... паглыбіць...» Думаеце, што гэта мала? Па думцы працаўнікоў ЦП саюзу — гэта ўсё, што трэба было зрабіць.

Паасобныя настаўнікі скрыўлялі клясавую лінію партыі

Пяройдзем да ЦП саюзу працаўнікоў асьветы. Зразумела, ЦП своячасова дало дырэктывы мясцом правесьці растлумачальную работу, ацягнуць настаўніцтва ў хлебазагатоўчую кампанію, дапамагчы мясцовым арганізацыям у гэтай рабоце і г. д. Але, як выконваюцца гэтыя дырэктывы? У ЦП саюзу працаўнікоў асьветы нам паведамілі, **што праверкі выкананьня гэтае дырэктывы яшчэ ня было,** што толькі 16-га кастрычніка будуць атрыманы адпаведныя весткі. А што зараз робіцца на мясцох, як настаўніцтва выконвае свае ганаровыя абавязкі — быць кіраўніком і ініцыятарам у здачы хлеба дзяржаве? **Гэтага ЦП саюзу ня ведае.**

Адзін толькі пратакол пленуму прафдэлегатаў саюзу працаўнікоў асьветы Самахвалавіцкага раёну ад 30-га верасьня гаворыць аб радзе ненармальных зьявішч у асяродзішчы настаўніцтва. У дакладзе і спрэчках было расказана **шмат фактаў скажэньня клясавай лініі асобнымі настаўнікамі, патураньня кулаку, выступленьняў некаторых настаўнікаў супроць плянавых разьмеркаваньняў здачы хлеба і г. д.**

Старшыня пленуму — сакратар мясцкому тав. **Лабус** заявіў, што частка настаўніцтва нават **не разьбіраецца ў пытаньнях хлебазагатовак.** Так, у Крупіцкім сельсавеце настаўнікі прабавалі тарговацца з кулакамі, зьніжаючы вызначаныя для іх нормы. У некаторых мясцох пры дапамозе настаўнікаў ухваліліся настановы аб здачы хлеба з гэктара або з падаткованага рубля. Гэта гаворыць аб тым, што **асобныя настаўнікі не зразумелі палітыкі партыі ў хлебазагатоўчай кампаніі.**

А ёсьць і выпадкі, калі некаторыя настаўнікі сьвядома праводзілі контррэвалюцыйную работу па зрыве хлебазагатовак. У вёсцы Слабала настаўніца **Хрущак зьбірала ў сябе ў хаце жанчын-сялянак і навучала іх, як змагацца з хлебазагатоўшчыкамі,** пры чым адзначала, што калі-б не настаўнік **Рымашэўскі,** які актыўна дапамагаў правесьці хлебазагатоўкі, усё было-б добра і ніхто нічога-б ня браў.

У Вярхмянскім сельсавеце адзін з настаўнікаў, нават камуністы, агітаваў за тое, каб ўсе сяляне здавалі хлеб у аднолькавай колькасьці. Загітаваны ім сход прыняў яго прапанову.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што дырэктывы ЦП саюзу **не дайшлі да ўсёй масы настаўніцтва,** што ЦП саюзу працаўнікоў асьветы **фармальна** аднеслася да падрыхтоўкі да хлебазагатоўчай кампаніі. **ЦП саюзу не знайшло новых форм і мэтадаў работы, каб мабілізаваць усю настаўніцкую масу для барацьбы з труднасьцямі хлебазагатоўчай кампаніі.**

ЦП саюзу транспраб слаба змагаецца з ненармальнасьцямі на транспарце

Як падрыхтаваўся саюз **транспраб?** Трэба адзначыць, што ЦП саюзу сёе-тое зрабіла. Работа грузчыкаў праведзена на бесьперапынны тыдзень. ЦП саюзу дапамагло стварэньню калектыву для вячэрніх работ, правяло вытворчую нараду прадстаўнікоў мясцкомаў грузчыкаў і чыгуначнікаў па пытаньні аб урэгуляваньні падачы вагонаў, па ініцыятыве ЦП прынцыпова вырашана пытаньне аб зьліцьці гужавога транспарту Менсельпрому з аўтатранспартам акрвыканкому. Вось і ўсё.

Калі-ж паглядзець, што робіцца пры пагрузцы або разгрузцы хлеба, дык мы ўбачым рад буйных недахопаў і ненармальнасьцяй. віна за якія **часткова кладзецца на ЦП саюзу транспраб.**

На складзе Ваенпрадмагу і на складах Саюзхлеба шмат недарэчнасьцяй з пагрузкай і разгрузкай. На складзе Ваенпрадмагу больш за два гады будуюць мэханічную падачу хлеба на 4-ты паверх. На складах Саюзхлеба, з-за адсутнасьці чыгункі да саміх складаў, разгрузка хлеба ідзе вельмі павольна і каштуе значна даражэй.

На чыгунцы шмат выпадкаў нядбайных адносін чыгуначнага персаналу і хлебазагатоўчых арганізацый да разгрузкі хлеба.

Не ўсе гэтыя факты ЦП саюзу транспраб рэагуе не з належнай рашучасьцю і хуткасьцю.

***

І саюз транспраб, і ўсе іншыя не падыйшлі да хлебазагатоўчай кампаніі з належнай сур'ёзнасьцю, **ня ўлічылі ўсяго палітычнага значэньня гэтае кампаніі ў пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы на вёсцы.**

Прафсаюзы ў лепшым выпадку абмежаваліся пасылкай некалькіх дзесяткаў брыгадзіраў на вёску, вусім ня цікавячыся работай тых установаў, ад якіх, галоўным чынам, залежыць добрае правядзеньне хлебазагатоўчай кампаніі і **кантроль над якімі складае асноўны абавязак кожнага адпаведнага ЦП прафсаюзу.**

Прафсаюзы ў хлебазагатоўчай кампаніі яшчэ не перайшлі на новыя формы і мэтады работы, не мабілізавалі прафсаюзныя масы для барацьбы з усімі труднасьцямі, якія сустракаюцца на шляху будаўніцтва сацыялізму, **не арганізавалі грамадзкай думкі супроць асобных сьвядомых шкоднікаў і бюракратаў, якія зрываюць важнейшыя мерапрыемствы партыі і савецкае ўлады.**

Самая лёгкая справа — гэта даць дырэктыву, паслаць абежнік, але правераць, **як гэтыя дырэктывы ажыцьцяўляюцца, дапамагчы нізавым праф'ячэйкам у іх штодзённай рабоце, своячасова рэагаваць на кожнае ненармальнае зьявішча або злачынства асобных членаў прафсаюзу — справа больш складаная.**

ПРАЎДЗІН.



НА ЗДЫМКУ: Чырвоныя абозы, арганізаваныя калгасамі «Вперад» і «Красный Пахарь» (Мазыршчына)

Гомельскі акрсуд вызваляе кулакоў ад штрафу

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У той час, калі партыяй мабілізаваны ўсе сілы на пасьпяховае правядзеньне хлебазагатовак і на барацьбу з кулацтвам, якое імкнецца затрымліваць хлеб, у гэты час у органах суду знаходзяцца працаўнікі, якія ня хочуць сварыцца з кулаком. Вось факты.

За несваячасовую здачу памольнага збору, за няправільны запіс у квітках цэрахаўскія млынары былі аштрафаваны Цэрахаўскім нарсудом ад 75 да 100 рублёў. Млынары падалі апэляцыю ў акруговы суд. І не дарэмна, яны не памыліліся. Акруговы суд пастанавіў: млынарэ Тодара Канцавога, які па індывідуальным ападаткаваньні плаціць 388 руб. с.-г. падатку, мае млын, 2-х коняй, 3 каровы, 7 сьвіней і 2 авечкі,— ад штрафу вызваліць. Млынару Май сеенка, які плаціць 260 руб. падатку, акруговы суд зьнізіў штраф з 75 да 25 рублёў. Млынар Оярдзюкоў, які плаціць 256 руб. падатку, **таксама вызвалены ад штрафу.**

Паданых фактаў даволі для таго, каб ахарактарызаваць лінію, калі не ўсяго акрсуду ды пасобных яго працаўнікоў.

„Налёт“ на Менскі чыгуначны вузел

Хлеб ляжыць пад адкрытым небам. На станцыі Менск склад 1½ гады заняты дошкамі Белсельсаюзу

Уначы, тры дні таму назад транспартная група НК РСІ БССР сумесна з Менскім вучпрафсожам і газэтай «Рабочий» быў арганізаваны масавы начны «налёт» на ўсе службы і ўстановы Менскага чыгуначнага вузла. У налёце прымала ўдзел 120 рабочых і служачых чыгуначнікаў.

Выяўлена, што працоўная дысцыпліна сярод рабочых і служачых Менскага вузла знаходзіцца не на належнай вышыні. Выяўлены факты, калі некаторыя прыходзілі п'янымі на работу. Рабочыя часта позьняцца і прыходзяць ня ў вызначаны тэрмін на працу. Так, «налётчыкі» выявілі, што адзін з змазчыкаў зьявіўся за 5 хвілін да адыходу цягніка замест таго, каб прыйсьці на гадзіну раней. Цягнік на Харкаў вышаў са значным спазьненьнем па тэй прычыне, што адзін з прычэпленых вагонаў аказаўся бяз тормазу. Таварныя цягнікі з-за нядбайнай работы пэрсаналу таксама прыбылі з спазьненьнем.

Вялікія брыдоты выяўлены ў справе выгрузкі вагонаў з хлебам. На мінулым тыдні прыбыўшыя вагоны з хлебам прастаялі два дні з-за несваячасовай выгрузкі.

23-га верасьня на адрас Саюзхлеба прыбыло на станцыю Менск 5 вагонаў з хлебам. З прычыны нераспарадчасьці і бязьдзейнасьці працаўнікоў Саюзхлеба выгружаныя 4.000 пудоў хлеба праляжалі да сёньняшняга дня пад адкрытым небам каля складу, дзе было досыць месца, каб гэты хлеб захаваць. На шчасьце былі пагодлівыя дні.

Акрамя таго выяўлена, што некаторыя арганізацыі несваячасова забіраюць сазе грузы са станцыі, грузамі забіваюцца склады і ўся тэрыторыя станцыі, што часта перашкаджае нармальнай рабоце вузла. Так, грузы Белхарчтрасту праляжалі цэлы тыдзень, грузы Менсельпрому праляжалі 10 дзён, ня гледзячы на тое, што Менсельпром мае свой транспарт.

На станцыі Менск вялізны склад, які мог-бы быць выкарыстаны для хаваньня хлеба, ужо паўтара гады заняты дошкамі Белсельсаюзу.

Грамадзкія арганізацыі Гомельшчыны прымалі слабы ўдзел у хлебазагатоўках

(Ад нашага гомельскага карэспандэнта)

У апошнія дні кулакі пачалі актыўна выступаць супроць хлебазагатовак.

У вёсцы Калыбані, Камарынскага раёну, кулакі замахваліся на жыцьцё старшыні спажывецкага т-ва і спалілі яго сядзібу.

У тэй-жа вёсцы кулак Піза напаў на бедняка Расюка, калі апошні прапанаваў стварыць камісію садзейнічаньня хлебазагатоўкам.

У вёсцы Асарэвічы кулакі заклікалі сялян узяць калы і разьбіць чырвоны абоз.

У вёсцы Маложыне, Брагінскага раёну, кулакі паслалі на сход сваіх жонак з тым, каб сарваць абгаварэньне пляну хлебазагатовак.

У вёсцы Уці, Цэрахаўскага раёну, кулакі і іх падпявалы распусьцілі чуткі аб тым, што Кіеў «заняты» палякамі, а ў Новазыбкаў дастаўлен эшалён з параненымі чырвонаармейцамі, таму трэба хаваць хлебныя прадукты.

У асобных вёсках кулакі падпальваюць маёмасьць вясковых актывістых. У вёсках Камарынскага раёну кулакі пад пагрозай прымушаюць сялян не здаваць каапэрацыі сваіх хлебных лішкаў.

Кулаком у некаторых мясцох дапамагае чужы элемэнт, які пралез у наш загатоўчы апарат.

У Гомельскім раёне нават асобныя кіраўнікі каапэрацыйных аб'яднаньняў зрываюць хлебазагатоўкі. У Камарынскім раёне асобныя вёскі, ня ведаюць нават, што такое чырвоныя абозы.

Сельсаветы таксама не заўсёды дапамагаюць хлебазагатоўкам. **У Веткаўскім раёне кулакі, пазбаўленыя голасу, працуюць сакратарамі сельсаветаў. У Брагінскім раёне асобныя старшыні сельсаветаў самі агітуюць супроць хлебазагатовак.**

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі ня ўсюды вытрымалі экзамэн на правільнае кіраўніцтва хлебазагатоўкамі. **Зарэгістраваны выпадкі, калі асобныя камсамольцы дзейнічалі супроць хлебазагатовак. Прафсаюзы яшчэ стаяць у баку.** Больш таго, некаторыя рабочыя і служачыя, якія жывуць у вёсцы, таксама прадаюць хлеб прыватніку. Супрацоўнік райсаюзу Гялезін прыязджае пайкі ў каапэратыве, а **свае хлебныя лішкі да 150 пуд. прадае на рынак.** Усе гэтыя спэкулянты застаюцца непакаранымі.

Мясцовыя органы павінны ў такіх выпадках ужываць больш рашуча адміністрацыйныя спагнаньні.

У Камарынскім раёне віноватыя ўжо прыцягнуты да судовай адказнасьці. Кулак Піда і інш. ужо асуджаны судом на 2-3 гады пазбаўленьня волі. Некаторыя пасьля адбыцьця пакараньня будуць высланы.

У большасьці вёсак кулакі атрымліваюць адпор непасрэдна ад **асноўнай масы вёскі.** У сяле Леніна, Цэрахаўскага раёну, **сялянства на выпазку кулаку адказала чырвоным абозам у 2.600 пуд. Сераднякі і беднякі акругі ўжо здалі больш за 2.000 тон хлебу.**

Ш. Р

За палітызацыю калдагаворнай кампаніі

У радзе іншых задач, якія стаяць перад пралетарыятам і яго партыяй у штодзённай рабоце па сацыялістычным будаўніцтве, буйнейшае палітычнае значэньне мае правадзімае кожны год перазаключэньне калектыўных дагавораў. Палітычнае значэньне калдагаворнай кампаніі заключаецца раней усяго ў тым, што ў працэсе гэтай кампаніі з най большай выразнасьцю выяўляецца ўзаемны, калі можна так сказаць, пераплёт інтарэсаў рабочае клясы цалкам, г. зн. рабочае клясы, як кіраўніка ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва, з інтарэсамі асобных груп, праслоек, частак пралетарыяту. Гэты пераплёт агульных і прыватных інтарэсаў, пры якім інтарэсы прыватныя павінны быць падначалены інтарэсам агульным, складае сутнасьць дагаворнай кампаніі.

Гэта асноўная сутнасьць калдагаворнай кампаніі не павінна затушавацца тэй акалічнасьцю, што па форме, пры заключэньні калектыўных дагавораў, мы маем два бакі—прафсаюз і гаспадарчы орган, якія як-бы «змагаюцца» паміж сабой за ўмовы дагавору. На самой справе калдагавор ня ёсьць дагавор двух бакоў з процілеглымі інтарэсамі, бо рабочая кляса зьяўляецца калектыўным гаспадаром вытворчасьці—калдагавор замацоўвае тыя абавязацельствы, якія бярэ на сябе пралетарыят цалкам, як кіраўнік краіны, перад асобным сваім атрадам у пытаньнях зарплаты, бытавых і прававых норм і г. д., і з другога боку, калдагавор устанаўляе тыя абавязацельствы (у галіне правіл унутранага распарадку, праддысцыпліны і інш.), якія ўскладваюцца на рабочых асобных прадпрыемстваў у адносінах іх да рабочае клясы цалкам.

Адсюль ясна, што посьпех калдагаворнай кампаніі вызначаецца раней усяго тым, у якой меры ў ходзе калдагаворнай кампаніі партыйныя, прафсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі змогуць растлумачыць шырокім рабочым масам задачы, якія стаяць перад пралетарыятам на даным адрэзку часу (напрыклад, на бліжэйшы гаспадарчы год), і ўвяжуць гэтыя агульныя задачы з прыватнымі інтарэсамі рабочых таго або іншага прадпрыемства. Толькі пры гэтай умове калдагаворная кампанія палітычна выхоўвае масы, узьнімае сьвядомасьць асобных груп рабочых ад інтарэсаў вузка-цэхавых да агульна-клясавых інтарэсаў.

***

Аналіз вынікаў калдагаворнай кампаніі за мінулы гаспадарчы год паказвае, што якраз у рашаючым пункце, у пытаньні аб палітычным значэньні кампаніі, увязцы агульных і прыватных інтарэсаў пралетарыяту мы мелі вельмі сур'ёзныя прабелы. Калдагаворная кампанія 1928-29 году ня была разгорнута, як шырокая палітычная кампанія. У аснове гэтага ляжала перш за ўсё трэд-юніёнісцкая абмежаванасьць прафсаюзаў, якія, выходзячы з таго, што не прадбачыцца значнага павышэньня зарплаты і да таго ў наяўнасьці харчовыя затрудненьні, стараліся «зьвярнуць» кампанію ў масах, правесьці яе чым хутчэй і цішэй. З другога боку наліча бюракратычных скажэньняў у гаспадарчых органах прыяло да таго, што замест шырокага растлумачэньня рабочым заданьняў прамфінплянаў у галіне павышэньня прадукцыйнасьці працы, узмацненьня працдысцыпліны і зьніжэньня сабекошту, гаспадарнікі сваю «работу» па перазаключэньні калдагавароў перанесьлі ў галіну спрэчак з-за асобных дробязяй.

Урокі калдагаворнай кампаніі 1928-29 году павінны быць такім чынам улічаны перш за ўсё па лініі рашучага паляпшэньня практыкі перазаключэньня калдагавароў з боку прафсыянальных і гаспадарчых органаў.

У цэнтры надыходзячай калдагаворнай кампаніі павінны стаяць палітычныя задачы. Трэба, каб у сьвядомасьці самых шырокіх рабочых мас было зусім выразнае разуменьне ўзаемазалежнасьці такіх плянавых заданьняў на 1929-30 год, як павышэньне прадукцыйнасьці працы на 23 проц., зьніжэньне сабекошту на 10 проц. і паляпшэньне рэальнай зарплаты на 13-14 проц. Трэба таксама ўмець увязаць гэтыя даныя, якія закранаюць усю прамысловасьць, з адпаведнымі паказальнікамі для асобнага прадпрыемства і нават цэху. Трэба, нарэшце, на гэтай аснове правільна злучыць інтарэсы асобных груп і глястоў рабочых з інтарэсамі рабочае клясы цалкам.

Ці ёсьць у нас патрэбныя ўмовы для таго, каб абярнуць перазаключэньне калдагавароў у шырокую палітычную кампанію, каб зрабіць гэту кампанію адпраўным этапам для новага пад'ёму творчай актыўнасьці мас.

Гэтыя ўмовы, калі гаварыць аб працэсах, што адбываюцца ўнутры рабочае клясы,—у наяўнасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва паказала, як у пралетарыяце з нястрыманай сілай расьце сьвядомасьць сваёй ролі калектыўнага гаспадара вытворчасьці. У рабочай масе ўсё ў большай меры выкрышталізоўваецца разуменьне таго, як прыватныя інтарэсы асобных груп павінны ўвязвацца з інтарэсамі клясы цалкам.

***

Такім чынам, аб'ектыўныя ўмовы для ператварэньня перазаключэньня калдагавароў у баявую палітычную кампанію зусім спрыяючыя. Справа за паляпшэньнем палітычнага кіраўніцтва гэтай кампаніяй з боку прафсыянальных і гаспадарчых арганізацый, а, значыцца, і парторганаў. Трэба палепшыць кіраўніцтва, г. зн. зламаць трэд-юніёнісцкія адрыжкі ў прафработнікаў і абвасьціць бязьлітасную вайну бюракратычным скажэньням гаспадарчых органаў

УсеЦСПС падаў сыгнал да перабудовы радоў і мэтадаў работы прафарганізацый, высунуўшы ў якасьці баявога лёзунгу лёзунг—«тварам да вытворчасьці». Надыходзячая калдагаворная кампанія павінна будзе паказаць, з якой хуткасьцю гэта перабудова радоў у прафсаюзах адбываецца, наколькі ўся маса прафсыянальных работнікаў паварочваецца тварам да новых задач. Калдагаворная кампанія з гэтага пункту погляду—буйнейшы палітычны экзамэн для прафсыяналістых.

З другога боку надыходзячая калдагаворная кампанія павінна даць рад прадметных урокаў па частцы барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі гаспадарчых органаў. Трэба прыкладна (у парадку і партыйным і судовым) пакараць рад гаспадарнікаў за невыконаньне ўмоў калдагавору, за неўгрунтаванае суцяжніцтва, за бюракратычныя адносіны да калдагаворнай кампаніі, як кампаніі масавай.

Палепшыць сваё кіраўніцтва калдагаворнай кампаніяй павінны і партарганізацыі. Партыйныя камітэты павінны арыентаваць вытворчыя ячэйкі на правядзеньне калдагаворнай кампаніі, як сапраўды масавай кампаніі. Партыйныя камітэты павінны забясьпечыць, нарэшце, кантроль за работай прафсаюзных і гаспадарчых органаў у справе перазаключэньня калдагавароў.

Перазаключэньне калдагавароў—палітычная кампанія. У працэсе гэтай кампаніі патрэбна праверка правільнасьці і выразнасьці палітычнай лініі асобных работнікаў, перш за ўсё гаспадарнікаў і прафсыяналістых. Правы ўхіл на практыцы заключаецца ня толькі ў простым патураньні клясаваму ворагу, але і ў ігнараваньні ініцыятывы мас, бюракратычным падыходзе да мас, у абароне вузкацэхавых інтарэсаў. Трэба выявіць гэтыя больш скрытыя, менш яўныя формы праяўленьня правага ўхілу для барацьбы з імі і перамогі іх. У гэтым таксама адна з палітычных задач калдагаворнай кампаніі.

В. Р.

(Изв. ЦК).

Пакуль што абмяжоўваюцца пасяджэньнямі

2 кастрычніка пры Гомельскім акрпрафбюро адбылася нарада вылучаных таварышоў для праверкі выкананьня сац. дагавароў. Выявілася, што ня ўсе вылучаныя таварышы прыступілі да працы. Многія прафработнікі глядзяць на сваю мабілізацыю, як на адбыцьцё «чарговай павіннасьці». Нарада прымушана была прызнаць, што саюзы (акрпраўленьне і ФЗМК), асабліва на чыгунцы, недаацэньвалі важнасьці гэтай працы, а лічылі, што гэту работу правядуць у парадку штодзённай работы. З прычыны такіх адносін кіруючых работнікаў, на фабрыках і заводах справы абстаяць ня лепш.

На запалкавай фабрыцы «Вэзэві» як падрыхтоўчая работа, так і ўцягненьне мас, праходзіць вельмі вяла, няма раскачкі. Падрыхтоўчая работа фактычна пачалася з 20-га верасьня. а брыгады ўсё яшчэ не па ўсёй фабрыцы выбраны, а выбраныя яшчэ не прыступілі да работы. Гэта ў пачатку кастрычніка, значыцца, верасень замест творчай работы, пашоў на размовы. Ня лепш справа абстаіць і на іншых заводах. Нявытворчыя-ж саюзы толькі пачынаюць разварушвацца. На агульна-гарадзкім сходзе ўсіх работнікаў Гом. ЦРК пачалі выбіраць рабочыя брыгады толькі 2-га кастрычніка. Калі-ж пачнецца фактычна праверка, аб гэтым вельмі цяжка сказаць. Толькі на папяровай фабрыцы «Гэрой Працы» справа абстаіць як быцьцам лепш. Там брыгады ўжо канчаюць праверку, пачынаецца падрыхтоўка да заключэньня новага дагавору па сац. спаборніцтве. Стары дагавор сацспаборніцтва колькасна выканан ня кепска, але якасна не на вышыні. Гэта больш за ўсё хвалюе ўсю заводскую грамадзкасьць, але прычына яшчэ ня знойдзена. Трэба сказаць, што цэхарганізацыі гэтай фабрыкі ўсё-ж не праявілі сябе актыўна ў гэтай рабоце.

В—ч.

ПРЫЗЫЎ ПРАХОДЗІЦЬ АРГАНІЗАВАНА

Падрыхтаваліся добра

Падрыхтоўчая праца да прызыву ў **Пухавіцкім раёне** прайшла добра. Праведзена шырокая нарада прызыўнікоў, а таксама па ўсіх сельсаветах праведзены сходы, на якіх добра растлумачаны мэты і задачы прызыву. Партыйнымі, камсамольскімі і культурнымі сіламі вёскі праводзіцца растлумачальная работа. Сьпісы непрацоўнага элемэнту абгавораны загадзя на пасяджэньнях груп беднаты, розных устаноў і арганізацый раёну.

Прызыўнікі добра ўявілі задачы Чырвонай армії. На сходы зьявіліся ўсе, як адзін.

Д. Р.

Выклікалі на сацспаборніцтва

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Работа Полацкага прызыўнога пункту праходзіць пры стопроцантнай яўцы прызыўнікоў. Наладжана культурнае абслугоўваньне прызыўнікоў: кіно, клюбамі, літаратурай і інш.

Прызыўнікі Гросьніцкага сельсавету, своячасова і поўнасьцю прыбыўшы на пункт, выклікалі на спаборніцтва прызыўнікоў Сосьніцкага сельсавету па своячасовай і стопроцантнай яўцы. А гэта ўжо кажа, што прызыўнікі зразумелі мэты і задачы сёлетняга прызыву.

Замест агітпункту—дамоў

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Работа прызыўной камісіі праходзіць пасьпяхова, яўка на ўсе 100 проц. Наглядаецца вялікая цяга ў кадравыя часьці. Ёсьць выпадкі адмаўленьня ад ільгот. Культурнае абслугоўваньне пастаўлена на належную вышыню.

А вось райсавет Асоавіяхіму праявіў вялікую нядбайнасьць і няўвагу ў справе абслугоўваньня-прызыўнікоў. Агітпункт парашыў пабудаваць цір і зьвярнуўся па гэтым пытаньні ў Асоавіяхім. Вылучаны райсаветам нейкі Клябанаў выдаў 2 вінтоўкі і патроны, замест адпраўкі на пункт—занёс да сябе дамоў. А пункт чакай ля мора пагоды.

Няма ўвагі

Адносіны мясцовых арганізацый да работы **Смалявіцкага агітпункту** кепскія. Таварышы, якіх вылучыў райком для правядзеньня гутарак, ня прыходзяць, а сам райком да гэтай пары таксама ня прымаў ніякіх мер супроць іх. Вось гэтыя таварышы: **Гаўрык, Вайнэр, Альтшулер** і інш.

Сам пам. паліткіраўніка тав. **Мятліцкі** забыўся аб існаваньні агітпункту. РК ЛКСМ абяцаў вылучыць для дзяжурства на агітпункце 2 камсамольцаў кожны дзень, але таксама абяцаньне ня выконваецца.

СЛУЖБА У ЧЫРВОНАЙ АРМІІ—ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК

Прызыў маладняка ў Чырвоную армію праходзіць па **Мазыры** з нябывалым пад'ёмам. Наглядаецца вялікі наплыў добраахвотнікаў.

З боку купцтва назіраецца [illegible]

Затое якою радасьцю дыша ад прыпятага працоўнага маладняка.

Ня гледзячы на тое, што ў гэтым годзе піўныя не зачыняліся, выпадкаў п'янства [illegible]

ВЫПРАЎЛЯЦЬ НЕДАХОПЫ

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Прызыўныя камісіі акругі працуюць здавальняюча. Прызыўнікі зьявіліся на пункты на 95 проц.

Настрой прызыўнікоў балзёры. Былі выпадкі, калі прызыўнікі адмаўляліся ад ільгот і прасілі залічыць іх добраахвотнікамі ў рады Чырвонай армії.

Заўважаныя ў першыя дні прызыву недахопы зараз зьнішчаны. Грамадзкія арганізацыі разгарнулі сваю работу. Камсамол таксама дапамагае палітычным кіраўніком. Каапэрацыйныя ларкі поўнасьцю забясьпечаны неабходнымі прадуктамі і бойка гандлююць. Прадаўцы ларкоў вельмі ўважліва адносяцца да запатрабаваньняў прызыўнікоў.

Прызыўнікі многіх паселішч зьяўляюцца на пункты арганізаваным парадкам. Выпадкаў п'янства, хуліганства сярод прызыўнікоў не наглядаецца.

ЛАРОК НЕ АБСЛУГОВАЕ

У газэтах было надрукавана, што прызыўнікі будуць забясьпечаны каапэрацыяй на месцы прызыву ўсім патрэбным. Наша група саўгаскіх рабочых, ведаючы пра гэта, ня брала з дому ніякіх харчоў. Вось і прышлося нам у **Чэрвені** блытацца па крамах, каб дзе дасталь 0,5 кгр. цукру, каб напіцца гарбаты. Нідзе нічога не далі. Старшыня праўленьня таварыства сказаў—«для вас у нас нічога няма, пры прызывучестку ёсьць ларок». У ларку ёсьць махорка, ды папяросы, але ларок з 3 галзін дня зачыняецца. Характэрна, што вінная крамка была адчынена да 9 галзін вечара.

Не абмяжоўвацца рэзалюцыямі

Пачынаньне партыйнага калектыву Добрускай фабрыкі «Гэрой працы», які першы стаў на шлях практычнага выкананьня лёзунгу—«Ні аднаго партыйца без «Зьвязды», з кожным днём усё больш і больш падтрымліваецца арганізацыямі КП(б)Б. Ужо больш за 25 проц. усёй КП(б)Б прыступіла да практычнага вырашэньня гэтай вялікай палітычнай справы. Больш за 25 проц. усёй КП(б)Б уступіла ў спаборніцтва па прасоўваньні «Зьвязды» ў шырокія масы працоўных.

Аднак, некаторыя партыйныя арганізацыі, акрамя таго, што ўхвалілі рэзалюцыю аб удзеле ў спаборніцтве, **амаль нічога не зрабілі і ня робяць для распаўсюджаньня «Зьвязды».** Некаторыя сакратары і АПА ячэек выступаюць аб'ектыўна нават супроць выпіскі «Зьвязды». Больш характэрным прыкладам у гэтым зьяўляецца ячэйка заводу «Рухавік Рэвалюцыі» (Гомель), дзе сакратар і АПА ячэйкі заяўляюць: «прымушаць члена́ў бюро выпісваць «Зьвязду» нельга, хто захоча, той і выпіша». У выніку **бюро ячэйкі адмовілася ад выпіскі «Зьвязды» і ад правядзеньня работы па распаўсюджаньні яе.**

На некаторых прадпрыемствах («Праца», «Пралетары», Гомель) у бюро ячэек разважаюць: — Бачыце, мы слаба разумеем беларускую мову, таму ў нас падпіска на «Зьвязду» слабая...

Гэтыя таварышы, як відаць, не разумеюць ня толькі беларускай мовы, але і нацыянальнай палітыкі нашай партыі і ўлады.

Партыйныя ячэйкі павінны памятаць, што **адныя рэзалюцыямі аб удзеле ў спаборніцтве абмяжоўвацца ні ў якім разе нельга.**

Пасьпяховасьць у рабоце па прасоўваньні «Зьвязды» ў масы зможа быць дасягнута толькі тады, **калі на прадпрыемствах, ва ўстановах, на вёсцы будзе разгорнута шырокая агітацыйна-растлумачальная работа аб вялікай ролі і значэньні «Зьвязды», калі гэта работа будзе стаяць у цэнтры ўвагі партыйных арганізацый. Раённыя камітэты** КП(б)Б павінны не абмяжоўвацца дырэктывамі ячэйкам, а сыстэматычна праяраць, як праламляюцца гэтыя дырэктывы ў штодзённай рабоце ячэек, ці праводзяцца яны ў жыцьцё?

Г.

Мала сабраць хлеб, трэба яго і захаваць

Бюракраты з ВСНГ зрываюць работу ўрадовай камісіі

У нашай газэце ўжо ня раз пісалася аб недахваце складзкіх памяшканьняў і фармальных адносінах у радзе ўстаноў да пытаньня дапамогі ўрадовай камісіі ў падшуканьні складаў і перадачы іх хлебазагатоўчым арганізацыям.

Але, як відаць

Падвысіць працоўную дысцыпліну

АЧЫСЬЦІЦЬ РАДЫ МІЛІЦЫІ АД ЧУЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ

Амаль што кожны дзень прыходзяць скаргі ў аддзяленьні міліцыі на дрэнную ахову заводаў міліцыянэрамі.

Аб тым, што міліцыянэры сьпяць на пастох ёсьць дзесяткі фактаў.

На Эльводзе міліцыянэр для спакойнага сну залез у тарфяную ваганетку вузкакалейнай чыгункі. Напярэдадні ваганэтка была прычэплена да цягніка і адпраўлена за горад па торф. А міліцыянэр прачнуўся ўжо толькі за горадам за 5 вёрст ад Эльводу.

У другога міліцыянэра на тым-жа Эльводзе ў часе яго сну ўкралі вінтоўку.

А вось яшчэ прыклады нядбайных адносін.

Рабочыя Мэншвэю захацелі праверыць, як ахоўваецца іх прадпрыемства. Адзін рабочы вынес пакунак рэчаў, а міліцыянэр зусім гэтага не заўважыў. Другі рабочы апранае жаночае паліто і вольна прайшоў праз тамбур, ня будучы затрыманым міліцыянэрам, бо апошні ўжо спаў. Калі-ж рабочыя пачалі дапытвацца, чаму міліцыянэр так нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў, то ён адказаў:

— Мне ўсё роўна, можаце сабе ўсю фабрыку расьцягнуць.

Нават больш таго, некаторыя міліцыянэры ня толькі нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў, а самі абкрадваюць даручанае ім прадпрыемства. Міліцыянэр, стоячы на пасту на сьпіртагарэлачным заводзе і карыстаючыся давер'ем і поўным доступам (бо ад яго нічога не замыкалася), сыстэматычна абкрадваў завод: краў гарэлку, сьпірт і розныя рэчы.

Нядаўна выявілася, што два міліцыянэры 1-га аддзяленьня міліцыі Ігнатовіч і Мамаш сыстэматычна абкрадвалі тыя прадпрыемствы, дзе ім даводзілася стаяць на пастох. На заводзе «Энэргія» яны цэлымі пудамі кралі медзь. Прычым адзін вартаваў, каб ніхто не перашкодзіў красьці, а другі з дапамогай яшчэ аднаго злодзея, краў і выносіў медзь з заводу. Але іх злавілі і зрабілі вобыск на кватэры. І што-ж? У іх знайшлі самыя рознастайныя рэчы тых прадпрыемстваў, дзе яны стаялі на пастох. Мыла, талеркі, розныя тавары в магазынаў МЦРК, розныя заводзкія інструманты, пячатка касіра «уплочено» і равальвэр, які быў украдзены ў 1-м аддзяленьні міліцыі. Ды ці варта пералічваць усе выпадкі саміх гапебных злачынстваў з боку міліцыянэраў?

Міліцыянэраў, заўважаных у злачынстве, перадавалі ў суд, а ў большасьці звальнялі. За 10 месяцаў у Менску былі звольнены 304 міліцыянэры, прычым 169 былі звольнены па іх уласным жаданьні. Трэба сказаць, што міліцыя зараз абярнулася ў сваясаслівы перасыльны пункт. Розныя, падчас досыць цёмныя асобы, залічваюцца ў міліцыянэры для таго, каб напасьці ў прафсаюз, набыць рабочы стаж і пасьля запісацца на біржу працы.

Прафсаюз, апрача акуратнага збору членскіх адлікаў, ніякай культурна-выхаваўчай працы сярод міліцыянэраў не вядзе. Калі было ўзьнята пытаньне аб адчыненьні для міліцыянэраў ленкутка, то прадстаўнік гарсавету тав. Пасынкоўскі сказаў, што міліцыя можа абыйсьціся і без ленкутка. А ў першым і трэцім аддзяленьнях міліцыі для адчыненьня ленкуткоў ёсьць добрыя мажлівасьці. Штат прамысловай міліцыі ўвесь час павялічваецца, а гэта гаворыць аб тым, што культурна-выхаваўчую працу сярод міліцыі трэба зрушыць з месца.

Апрача гэтага, трэба перавесьці міліцыю на ўстаноўнае палажэньне.

Трэба павесьці рашучую барацьбу за падняцьце дысцыпліны сярод міліцыянэраў з тым, каб ахова нашых фабрык і заводаў значна палепшылася. Трэба, каб кожны рабочы, каб кожны гаспадарнік, каб уся пралетарская грамадзкасьць ведала, што заводы ахоўваюцца добра, што міліцыянэр, якому даверылі ахову заводаў, будзе пільна вартаваць, будзе аддана і сумленна адносіцца да сваіх абавязкаў.

МІЛІЦЭЙСКІ.

КІНО

„НАНУК"

(Кіно „Інтэрнацыяная")

«Нанук»—гэта культур-фільм, які паказвае, як жыве эскімоская сям'я ў Арктыцы. Сям'я эскімоса павінна блукаць разам з ім па сьнежнай пустэчы ў пошуках харчоў, палюючы на розных паўночных зьвяроў.

Фільм зьнімаўся ў Арктыцы, і ўсё, што мы бачым на экране, гэта сапраўднае жыцьцё. Ні акцёраў, ні дэкарацыі, ні кіно-трукаў у гэтай карціне няма. Кіно апарат фіксаваў пры 50-ці градусным марозе, сьнежных бурах і завірухах тую надзвычайную цяжкую працу і загартаванасьць эскімосаў, без якой жыцьцё на поўначы не магчыма.

Расказ кіно-істужкі аб пабудове сьнежнае хаты—«іглы»,—цалкам зроблена з сьнежных плітак пры дапамозе касьцянога нажа, аб жыцьці ў гэтай сьнежнай «хаце», язьдзе эскімосаў на сабаках, паляваньні на паўночную лісу і цюленя глядзіцца з вялікай цікавасьцю і захапляе глядача.

Тэхнічна фільм зроблены вельмі ўдала. Здымкі ясныя і сьветлыя. Мантаж фільму таксама добры. Л.

СУД

За эксплёатацыю батракоў

Выязная сэсія па працоўных справах разглядзела ў саўгасе імя Розы Люксэмбург справу кулака **Юрэвіча**, які эксплёатаваў батракоў **Фінкеля і Багданава.**

Кулак **Юрэвіч** ігнараваў законы аб працы і самым бязьлітасным спосабам у працягу году эксплёатаваў сваіх батракоў. Дагавор на батракоў ня быў заключаны. Ён забараняў батракам хадзіць у школу і прымушаў працаваць па 13-15 гадзін у дзень. Акрамя таго, **Юрэвіч** зьдзекваўся і зьбіваў батракоў.

Суд прыгаварыў Юрэвіча на два гады зьняволеньня і аштрафаваў на 500 руб. Акрамя таго, пастаноўлена спагнаць з Юрэвіча ў карысьць батракоў 900 руб.

Справа контр-рэвалюцыянэраў з вёскі Ніва

Кулакі Рэтхаў, Крышнёў і інш. пад кіраўніцтвам былога польскага жандара **Удачкіна** Міхася сыстэматычна зрывалі ў вёсцы Ніва, Жлобінскага раёну ўсе мерапрыемствы савецкае ўлады. Яны вялі агітацыю супроць самаабкладаньня, падбухторвалі сялян не здаваць хлеба каапэрацыі.

Асабліва шалёную барацьбу павяла гэта кулацкая зграя супроць беднаты, калі ў в. Ніва ўзьнята было пытаньне аб земляўпарадкаваньні.

Кулакі патрабавалі ад беднякоў па 100 руб. за дзесяціну зямлі, якая пры земляўпарадкаваньні павінна была адыйсьці ад іх да беднаты.

Гэта група вяла агітацыю супроць калектыву «Чырвоная Ніва», які арганізаваўся выключна з бядняцтва. **Удачкін і Крышнёў** пачалі палохаць беднату прыходам палякаў і інш.

У часе правядзеньня вайсковых манэўраў Удачкін з сваімі кампаньёнамі распускаў сярод сялянства чуткі, што гэта не манэўры, а сапраўдная вайна.

За ўсю гэтую контр-рэвалюцыйную дзейнасьць **Удачкін, Крышнёў і Рэтхаў** былі арыштаваны.

Судзіла іх надзвычайная сэсія Вярхоўнага суду ў гор. Жлобіне.

Удачкін і Крышнёў прыгавораны на 6 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем кожны. Акрамя таго, ім забаронена жыць ў 100 клм. прымежнай паласе ў працягу 3-х год пасьля адбыцьця пакараньня.

Рэтхаў прыгавораны да 3-х год зьняволеньня. Усе асуджаныя пазбаўлены выбарчых правоў тэрмінам на 3 гады кожны. Прыгавар ніякаму абскарджаньню не падлягае. Б—ць.

МЕНСК

Па БССР рэалізавана 3-яй пазыкі на суму каля 15 мільёнаў рублёў

Згодна апошніх вестак Наркамфіну, падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі па БССР дала 14.628.500 руб., што складае 130 проц. заданьня. З гэтае сумы сярод рабочых рэалізавана пазыкі на 12.520.000 руб.—139,1 проц. заданьня, сярод сялян—на 1.045.900 руб.—69,7 проц. заданьня, сярод неарганізаванага насельніцтва—1.062.300 руб.—141,6 проц. заданьня. З агульнай сумы афармлена падпіскі на 11.772.200 руб.

Трэба адзначыць, што рэалізацыя пазыкі сярод сялянства праходзіць слаба, асабліва ў Бабруйскай, Гомельскай і Мазырскай акругах.

2 мільёны рублёў на пабудову цэмэнтовага заводу

Белстрамтрэст заключыў дагавор з «Стромстроем» на праектаваньне і мантаж першага на Беларусі цэмэнтовага заводу ў Крычаве. Згодна дагавору, рабочыя чарцяжы павінны быць прадстаўлены з такім разьлікам, каб да пабудовы заводу можна было прыступіць у маі 1930 году. Эскізны праект заводу ўжо зацьверджаны. Гэтымі днямі будзе разгледжаны тэхнічны праект. Для кансультаваньня будаўніцтва запрошана рад выдатных маскоўскіх спэцыялістых, у тым ліку праф. Юнг і інш. Пабудова заводу будзе весьціся Белдзяржстроем. Для пачатку работ адпушчана да 2 мільёнаў руб.

Чырвоны абоз з прыгарадных сельсаветаў

Сяляне Строчыцкага і Сеньніцкага сельсаветаў здалі Менскаму прыгараднаму опажывецкаму таварыству «Земляроб» 2500 пудоў хлеба.

На мітынгу, які адбыўся на Пляцы Волі, вітаў здатчыкаў хлеба прадстаўнік Менгарсавету т. Пароль чык.

За дзень

Бібліятэчны паход. Калегія Наркамасьветы пастанавіла распачаць з 1-га лістапада бібліятэчны паход па БССР. Мэта паходу—прыцягнуць увагу рабочых мас да бібліятэчнае справы.

Усебеларуская дашкольная канфэрэнцыя. Калегія Наркамасьветы склікае ў бліжэйшы час усебеларускую дашкольную канфэрэнцыю. У канфэрэнцыі прымуць удзел да 60 дэлегатаў ад дашкольных установ Беларусі.

Чарговы тыраж пазыкі індустрыялізацыі. Дзевяты тыраж першае пазыкі індустрыялізацыі адбудзецца 20-22 лістапада ў Віцебску.

Вагон-музэй. Гэтымі днямі ў Менск прыбывае з Калугі вагон-музэй. Вагон абсталяваны аддзелам аховы здароўя Заходніх чыгунак. Будзе наладжаны рад экскурсій рабочых у музэй.

Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод рабочых. ЦК хэмікаў СССР адпусьціў 5 тысяч рублёў на ліквідацыю няпісьменнасьці сярод рабочых хэмікаў Беларусі.

Школы для беспрацоўных. На біржы працы арганізуюцца тры школы і 2 ліквпункты для ліквідацыі няпісьменнасьці сярод беспрацоўных. Школы ахопяць да 200 чалавек. Арганізуюцца таксама гурткі для вывучэньня беларускай мовы.

Назначэньне: Дырэктарам Беларускага трэсту сьпіртавой прамысловасьці назначаны тав. **Шэмпэль.**

Усебеларуская студэнцкая канфэрэнцыя. Сёньня ў Менску адкрываецца першая ўсебеларуская канфэрэнцыя культасьветных працаўнікоў прафарганізацыі студэнцтва. У рабоце канфэрэнцыі прыме ўдзел каля 100 чалавек. У парадку дня стаяць пытаньні аб масавай рабоце, аб прафпалітасьвеце і г. д.

Работа трамваю. 14-га кастрычніка менскім трамваем перавезена каля 15 тысяч пасажыраў.

Пленум ЦБ пралетстуду. 19-га кастрычніка ў Менску склікаецца чарговы пленум ЦБ пралетстуду Беларусі. На парадку дня даклад Наркамасьветы, аб сацыялістычным спаборніцтве, аб матар'яльна-бытавых умовах студэнцтва і інш.

Назначэньні

Тав. **С. Некрашэвіч** вызваленны СНК БССР ад абавязкаў члена калегіі Наркамасьветы. Членам калегіі Наркамасьветы назначаны тав. **Панкевіч.**

Праф. **Серада** назначаны намесьнікам старшыні камітэту па арганізацыі беларускага інстытуту прамысловасьці.

Павялічэньне пэнсіі інвалідам вайны

СНК БССР устанавіў новыя павышаныя стаўкі пэнсій для інвалідаў вайны і сем'яў забітых.

Першая група адзінокіх інвалідаў у гарадох Менск, Віцебск і Гомель атрымае па 27 руб., у іншых акруговых гарадох—25 руб., іншых мясцовасьцях—22 руб. Для другой групы адзінокіх інвалідаў устаноўлены стаўкі ад 15 руб. да 19 руб., для трэцяй групы—ад 10 руб. да 12 руб.

Для сямейных інвалідаў вызначаны стаўкі ад 12 р. да 31 руб.

Для сем'яў забітых на вайне ўстаноўлена стаўка ад 6 р. да 9 р. пры адным члене сям'і; з 11 р. да 13 р. пры 2-х членах сям'і і ад 15 да 19 р. пры 3-х і больш членах сям'і.

Вячэрнія курсы для павышэньня кваліфікацыі рабочых будаўнікоў

У лістападзе ў Менску, Магілеве, Гомелі, Барысаве, Воршы адкрываюцца вячэрнія курсы на павышэньні кваліфікацыі рабочых-будаўнікоў. На курсах арганізуецца рад груп па розных прафесіях. Курсы прапусьцяць каля 500 чалавек. Для павышэньня кваліфікацыі сэзоньнікаў - будаўнікоў адкрываюцца вячэрнія курсы на 100 чалавек у вёсцы Агародня, Гомельскай акругі.

Здарэньні

За злачынствы па службе і незаконную пасылку на працу аддаецца пад суд б. супрацаўнік менскай біржы працы **Батурчык.**

Затрыманы хуліганы Бібельнікаў, Вацлянчык, Лазоўскі і інш., які займаліся дэбошамі на біржы працы і адмаўляліся ад пасылкі іх на работу.

ЗА ПРАСЬЛЕДВАНЬНЕ РАБКОРАЎ—ПАД СУД

У краме МЦРК № 84 на пасадзе загадчыка працаваў тав. **Гурвіч**, які зьяўляецца адным з актыўных рабкораў, членам групкому саюзу, старшынёю эканомкамісіі і інш.

Тав. Гурвіч сумленны і адданы працаўнік. На працягу доўгага часу Гурвіч, як актыўны рабкор, у заметках, зьмешчаных у насьценных і друкаваных газэтах, недахваты ў рабоце МЦРК, падкрэсьліваючы значныя хібы ў працы арганізацыі. Усё гэта дало прычыну загадчыку арганізацыі. т. Альпяровіч наваліцца на тав. Гурвіча і ўжыць усе захады, каб пазбавіцца ад яго, як актыўнага рабкора і... Гурвіч звальняецца з працы, нібы за невыкананьне заданьня праўленьня МЦРК.

Рабкораўская грамадзкасьць не прайшла міма звальненьня Гурвіча з работы. Рабкоры дасканала расьсьледвалі прычыны звальненьня. У выніку выявілася, што тав. **Гурвіч ні ў чым не вінаваты.** Яго звольнілі з работы бяз усякіх падстаў.

16-га кастрычніка гэтага году ў ЦП саюзу саўтандальслужачых разглядалася справа аб звальненьні тав. Гурвіча з працы у прысутнасьці рабкораў і прафактыву. Таварышы, якія выступалі, падкрэсьлілі з усёй рашучасьцю патрэбнасьць прыцягненьня да адказнасьці глупцыцеляў самакрытыкі з праўленьня МЦРК.

Якімі мізэрнымі былі апраўданьні члена праўленьня МЦРК тав. Кудзяна, які гаварыў: «Мы ня ведалі, што Гурвіч зьяўляецца членам групкому і таму не ўгледнілі пытаньня аб звальненьні з саюзам».

Дзіўна, як працаўнікі праўленьня МЦРК маглі ня ведаць, што тав. Гурвіч зьяўляецца членам групкому, калі яны з ім амаль кожны дзень сустракаліся па рабоце.

На пасяджэньні рабкоры падкрэсьлівалі, што выпадак з тав. Гурвічам не зьяўляецца адзінкавым. Рабкоры гаварылі, што ў МЦРК пануе зажым самакрытыкі.

Гэтым зьдзекам павінен быць пакладзены канец. Пралетарская грамадзкасьць ня можа маўчаць, бачачы гэтыя ганебныя зьдзекі над рабкорамі з боку асобных працаўнікоў МЦРК.

Зусім правільна зрабіла ЦП саюзу саўтандальслужачых, ухваліўшы пастанову аб безадкладным аднаўленьні тав. Гурвіча на рабоце, а справу ў галіне прасьледваньня рабкораў перадаць у пракуратуру.

САША ПЧОЛКІН.

20-га кастрычніка 1929 г., а 10-й гадзіне раніцы

ў ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ЦК КП(б)Б (вуліца Карла Маркса, дом № 14)

СКЛІКАЕЦЦА

нарада сакратароў калгасных ячэек КП(б)Б

з наступнай абвесткай дня:

1. Аб чарговых задачах партыйнай, выхаваўчай і масава-палітычнай працы ў калгасах і саўгасах.
2. Аб становішчы калгасаў і мерапрыемствах па ўзмацненьні іх.
3. Бягучыя справы.

Рэгістрацыя ўдзельнікаў нарады будзе праводзіцца 19 і 20-га кастрычніка ў сакратара арганізацыі ЦК (1-шы паверх, пакой 7).

Па прыезьдзе ў Менск зьяўляцца ў ЦК для рэгістрацыі і атрыманьня памяшканьня.

ЦК КП(б)Б.

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА АКРВЫКАНКОМУ

Рост народнае гаспадаркі Меншчыны

Учора, у памяшканьні клюбу АВК адкрыўся трэці пленум Менскага АВК. Не пленум зьявіліся прадстаўнікі ад усіх раёнаў акругі ў ліку 45 чалавек.

З дакладам аб кантрольных лічбах народнае гаспадаркі Менскае акругі выступіў тав. **Рабіновіч,** які адзначыў, што плян работ па акрузе, паводле пяцігодкі, па многіх галінах выкананы з перавышэньнем. Так, плошча пад калгасамі за адзін год павялічылася на 356 проц. Плошча, ахопленая кантрактацыяй, павялічылася на 72 проц., ачыстка збожжа — на 200 проц. у параўнаньні з мінулым годам.

Паводле кантрольных лічбаў, на 1929-30 год мяркуецца павялічэньне ўраджайнасьці ў індывідуальных гаспадарках на 20 проц., у калгасах — 25 процантаў і па саўгасах — на 35 проц.

Плошча калгасаў будзе пашырана на 132 тысячы гэктараў, пры чым сярэдні разьмер аднаго калгасу будзе даведзены да 250 гэктараў. На індустрыялізацыю і электрафікацыю вёскі адпускаецца паўтара мільёны рублёў, на дарожнае будаўніцтва — 1.159 тыс. рублёў.

Нарасьветай мяркуецца ахапіць усіх дзяцей 8-гадовага ўзросту, па акрузе будзе адкрыта 162 новыя школы.. Наогулжа на народную асьвету адпускаецца 5 мільёнаў 600 тысяч руб.

Значна павялічаны сродкі на прамысловае будаўніцтва.

Пасьля дакладу тав. Рабіновіча распачаліся спрэчкі.

Нядзельны унівэрсытэт у Барысаве

Культаддзел ЦСПСБ і сэкцыя навуковых працаўнікоў адкрываюць у Барысаве нядзельны рабочы унівэрсытэт. Унівэрсытэт пачне працаваць з 1-га лістапада. Для чыткі лекцый у Барысаў будуць пэрыядычна выяжджаць з Менску члены сэкцыі навуковых працаўнікоў.

Каапэрацыйныя навіны

З 18-га кастрычніка МЦРК пачынае выдачу талёнаў на бялізну. Калектывы атрымаюць талёны ў крамах, да якіх яны прымацаваны.

***

МЦРК адкрыў у доме № 6, па Ленінскай вул., майстэрню для дробнае перапрацоўкі гатовае вопраткі, якая купляецца ў крамах МЦРК.

Чыстка ячэйкі Наркампрацы БССР.

З 18-га па 28-е кастрычніка ў памяшканьні ленкутка дзяржбанку (рог вул. Савецкай і Камсамольскай, уваход са двара) штодзенна з 6 гадз. увечары будзе праводзіцца чыстка членаў і кандыдатаў КП(б)Б ячэйкі Наркампрацы. Просьба да ўсіх рабочых і служачых прыняць актыўны ўдзел у працы праверачнай камісіі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Сёньня, а 8 з пал. гадз. увечары ў доме пісьменьніка (Савецкая, 68), адбудзецца сход менскай філіі Бел. АПП.

На парадку дня:

Аб нацыянал-дэмакратызьме і нацыянал-фашызьме—даклад т. А. Некрашэвіча.

На сход запрашаюцца члены «Полымя», «Узвышша», члены таварыства драматургаў і кампазытараў, усе пісьменьнікі і рэвалюцыйныя мастакі.

Бюро Філіі.

— У суботу, 19 кастрычніка, а 7-й гадзіне ўвечары ў доме санасьветы адбудзецца пленум Менскага камітэту таварыства па барацьбе з алкагалізмам.

На парадку дня наступныя пытаньні: аб мерапрыемствах па барацьбе з шынкарствам; аб правядзеньні па Менакрузе антыалкагольнага тыдню; давыбары ў прэзыдыум камітэту.

Абавязкова прысутнасьць усіх членаў камітэту, членаў рэвізійнай камісіі, удзельнікаў камісій камітэту і бюро ячэек па барацьбе з алкагалізмам.

На пленум запрашаюцца прадстаўнікі Наркамюсту, НК аховы здароўя, акрінспэктуры аховы здароўя і нарасьветы, АК КП(б)Б і КСМ, акрбюро юных піянэраў, ЦСПСБ і ЦП саюзаў, Менгарсавету, сэкцыі аховы здароўя і рэдакцыі менскіх газэт.

Прэзыдыум камітэту.

— У суботу, 19-га кастрычніка роўна а 6-й гадзіне ўвечары, у залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Дом Працы, II-гі паверх) адкрываецца IV-ты пленум ЦБ Пралетстуду, на які запрашаюцца: т. т. Калодка, Клімковіч, Вайтэнкаў, Мельнік, Папова, Мурэіч, Каменштэйн (прафсаюзы), Купрыянаў, Стальмашонак, Гольмшток, Радзіеўскі, Пічэта, Каранеўскі, Рыўлін, Хурсік, Прылежаеў, Вальфсон, Ўсьпенскі, Кроль, Лысоў, Казакоў, Панкевіч, Саевіч, усесклады Выканбюро, прафкомаў і прадстаўнікі студэнцтва ў праўленьні, і дэканаты, падрады і рэдакцыі студэнцкіх газэт.

Парадак дня пленуму:

1. Даклад Наркамасьветы аб рэалізацыі пастаноў ліпнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б па падрыхтоўцы спэцыялістых.
2. Аб сацыялістычным спаборніцтве ў навучальных установах.
3. Аб сумеснай працы прафсаюзных камсамольскіх арганізацый у навучальных установах.
4. Вынікі II-га пленуму ўсесаюзнага ЦБ ПС.
5. Аб матар'яльна-бытавым становішчы студэнцтва.

— НЯДЗЕЛЬНЫ РАБОЧЫ УНІВЭРСЫТЭТ. У нядзелю, 20-га кастрычніка, у 41-й аўдыторыі БДУ, (Земляробскі завулак) адбудуцца заняткі нядзельнага рабочага унівэрсытэту. Будуць прачытаны 2 лекцыі: 1) па палітэканоміі—асп. Аксельродам з 11 да 1 гадз., 2) будова сусьвету—дац. Сагаловічам з 1 гадз. да 3-х.

Прыём заяў ад уноўпаступаючых працягнут да 25 кастрычніка.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня—кіно «Луна зьлева». Пач. а 8 і 10 гадз.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. У сераду 23 кастрычніка г. г. Юнацкая сэкцыя Дому наладжвае дыспут на тэму: «Пралетарская літаратура ў Беларусі» з уступным словам выступіць загадчык АПАД ЦК КП(б)Б т. Сенкевіч.

У якасьці апанэнтаў выступяць: праф. Вальфсон, праф. Ігнатоўскі, праф. Барычэўскі, праф. Піотуховіч, дац. Вухаркін, т. Бабарэка, т. Галавач, т. Канаплін, т. Алахновіч і інш. таварышы, а таксама прадстаўнікі літаратурных аб'яднаньняў Бел. АПП, Полымя і Узвышша.

Білеты ў кандылярыі Дому.

— ПЭД. ГАБІНЭТ. Сёньня, 18 кастрычніка, роўна а 7 гадз. ўвечары адбудзецца 1-ы арганізацыйны сход сэкцыі грамадзка-карыснай працы, самакіраваньня і піанэрруху.

У панядзелак, 21 кастрычніка, а 7 гадз. увечары—1-ы сход сэкцыі палітэхнічнага выхаваньня.

Яўка настаўнікаў і піанэрпрацаўнікоў, якія запісаліся для працы ў сэкцыях, абавязкова.

Яшчэ аб галавацяцтве на пабудове унівэрсытэцкага гарадка

Зьявіліся шчыліны ў трубах кацельнай

Некалькі раз ужо зазначалася на тое, што месца для кацельні унівэрсытэцкага гарадку вызначана вельмі няўдала. Кацельная зьмешчана ў падвале прыродазнаўчага корпусу. Дымавыя трубы таксама прышлося зрабіць ва ўнутраной сьцяне. Зараз пры пробнай топцы двух катлоў зьявіліся шчыліны ў сьценцы адной з труб. Гэта тлумачыцца тым, што сьценкі труб складзены ў адну цагліну, а ня ў паўтары. Гэтыя шчыліны зьявіліся пры дрыўяным апале, а пры ўжываньні вугалю яны ад большага награваньня стануць шырэй.

Пры кладцы труб дапушчана яшчэ адна памылка: трубы складзены на мяшаным растворы, а трэба было на цэмэнтна-гліністым, які лепш вытрымлівае высокую тэмпэратуру.

Ёсьць яшчэ адзін вялікі дэфэкт у пабудове, які магчыма і зьяўляецца галоўнай прычынай, што выклікала шчыліны. Гэта надзвычайная кароткасьць гарызантальнага каналу, які падводзіць дым з катла да каміноў. Паколькі гэты канал кароткі, то ў трубу трапляе ня толькі дым, як гэта павінна быць на самой справе, а і полымя. Вось гэтая акалічнасьць і ёсьць першапрычына шчылін, якія зьявіліся ў трубах. Усё гэта сьведчыць аб тым, што кацельную трэба было будаваць у асобным памяшканьні, а ня ў падвале корпусу.

Цяпер трэба будзе перакладваць сьценкі труб, пераабсталёўваць іх. А ўсё гэта патрабуе дадатковых сродкаў.

Для зьнішчэньня ўсіх гэтых дэфэктаў тэрмінова выкліканы з Масквы кіраўнік акцыянэрнага т-ва «Госсантехстрой» інжынэр Перфільеў, які кіраваў устаноўкаю ацяпленьня на гарадку і праф. Каштароў, праектаваўшы гэта ацяпленьне.

ЗОДЧЫ.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

ПРЭМ'ЕРА

Пятніца, 18 кастрычніка спэктакль для 26 савецкай школы

Білеты ў школе і ў касе тэатру

Д. Бергельсон

ГЛУХІ

Пачатак спэктакляў роўна а 8 з пал. гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Мастацкі фільм

СТАРОЕ І НОВАЕ

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —

КІНО-ХРОНІКА САЎКІНО № 43

і інфармацыя Белдзяржкіно ТРАМВАЙ ПАШОЎ

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ

Амэрыканскі фільм

НАНУК

у 6-ці частках.

Звыш праграмы: хроніка Саўкіно № 49.

Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

Новы амэрыканскі фільм

СТАРАЯ № 99

рыгінальная камэдыя ў 6 частках.

Звыш праграмы: кіно-хроніка Саўкіно № 53

Пачатак сэансаў а 7 з пал. г. Каса—ад 6 г

1-шы дзіцячы кіно-тэатр Юны Піянэр

Адна з лепшых карцін сусьветнай кінэматагр.

ЧАНГ (Жахі джунгляй)

у 6 частках.

Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і сэрадах ад 12 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК

Ад аўторка 15 кастрычніка выдатны фільм

Цяжкія гады

драма ў 9 частках.

Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 м

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" званоце па тэл. 7-81

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" званоце па тэл. 2-49

АБВЕСТКА

МЕНСКАГА АКРУГОВАГА ІНСПЭКТАРА ГАНДЛЮ

ад 16-X-1929 году.

1) На падставе пастановы Наркамгандлю і Наркамуньсправ за № 49 ад 7-X-1929 году, Акрганнлю абвяшчае ўстаноўленыя па Менскай акрузе цьвердыя загатавіцельныя цэны на буйную рагатую жывёлу і сьвіньняў і розьнічныя цэны на мяса рознае і сала для дзяржаўных, каапэрацыйных і прыватных мясазагатавіцеляў і прадаўцоў.

А. Загатавіцельныя цэны на буйную рагатую жывёлу па Менакрузе

(цэны ўстаноўленыя за пуд убойнай вагі пад сцурай)

РАЁН	Вышэйшай упітан.	Выш.-сярэдн. упітанасьці	Сярэдняй упітан.	Бугай вышэй 10 п.	Бугай да 10 пудоў
Гор. Менск	12 р. — к.	10 р.	8 р. 50 к.	9 р. 30 к.	8 р. 50 к.
» Барысаў	11 р. 50 к.	9 р.	8 р. 20 к.	9 р. 30 к.	8 р. 20 к.
Усе раёны	11 р. — к.	9 р.	8 р. — к.	8 р. 75 к.	8 р. — к.

Б. Загатавіцельныя цэны на сьвіней

РАЁН	Сальныя	Поўсальныя	Мясныя
Гор. Менск	14 р. — к.	10 р. — к.	9 р. — к.
» Барысаў	14 р. — к.	10 р. — к.	9 р. — к.
Усе раёны	13 р. 50 к.	9 р. 50 к.	8 р. 50 к.

В. Розьнічныя цэны на мяса і сала за кілёграм

РАЕН	МЯСА ГАВЯЖАЕ			Мяса сьвіное	САЛА СЬВІНОЕ	
	I-га гат.	II-га гат.	III-га гат.		I-га гат.	II-га гат.
Гор. Менск	82 к.	70 к.	45 к.	82 к.	1 р. 40 к.	1 р. 15 к.
» Барысаў	82 к.	70 к.	45 к.	82 к.	1 р. 40 к.	1 р. 15 к.
Усе раёны	63 к.	55 к.	—	70 к.	1 р. 25 к.	1 р. 05 к.

УВАГА: Цэны згодна табліцы «В» устаноўлены для ўсіх мясагандлюючых арганізацый і асоб, за выключэньнем цэн на гавяжае мяса па гор. Менску і Барысаве для прыватных мясагандляроў, якім устанаўліваецца цэна мяса I-га гат.—73 кап. кагр., а II-га гатунку—60 кап. кілр.

2) Абавязваю ўсіх мясазагатавіцеляў як дзяржаўных, гэтак і прыватных, усе мясагандлёвыя прадпрыемствы як дзяржаўныя, каапэрацыйныя, гэтак і прыватныя, захоўваць устаноўленыя загатавіцельныя і розьнічныя цэны.

3) Абавязваю паказаныя ў п. № 1 прадпрыемствы і асобы мець на відных мясцох сваіх гандлёвых памяшканьняў табліцу паказаных у гэтай пастанове цэн.

4) Вінаватыя ў парушэньні гэтае пастановы падлягаюць адказнасьці паводле 152 арт. Крым. Кодэксу БССР.

5) Нагляд за выкананьнем пастановы ўскладзен на органы міліцыі.

6) Устаноўленыя цэны ўваходзяць у моц з моманту апублікаваньня.

Акруговы Інспэктар Гандлю ГРАВІТ

АБВЕСТКА

Даводзіцца да ведама дзяржаўных, каапэрацыйных арганізацый і клієнтуры, што

з 18-X г. г. ст. МЕНСК МББ чыг. ВЫТВАРАЕ КАМЭРЦЫЙНЫЯ АПЭРАЦЫІ

ад 7 гадз. да 22 гадз.

Прыём грузаў — АД 8 ГАДЗ. ДА 18 ГАДЗ. з перапынкам ад 12 да 14 гадз.

Выдача і выгрузка — АД 7 ГАДЗ. ДА 22 ГАДЗ. з перап. ад 11 да 13 гадз.

Рэспубл. бюро АРУ

Сёньня, а 6 з пал. гадз. увечары, у памяшканьні Белпабгандлю (Ленінская, дом Камунбанку)

)—(адбудзецца)—(

СХОД ЧЛЕНАЎ ГАНДЛЕВА-КААПЭРАЦ. СЭКЦЫІ АРУ

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб балянсавай кампаніі, 2) аб сацыялістычным спаборніцтве, 3) аб вучоце вэксальных апаратаў па сыстэме калірвучот, 4) аб пляне працы сэкцыі.

ЯЎКА ЧЛЕНАЎ СЭКЦЫІ АБАВЯЗКОВА

Запрашаюцца рахунк. работнікі гандлёва-каапэрац. устаноў, а таксама актыў АРУ.

СЬПІС

падпісчыкаў, якім не дастаўляецца газэта «ЗЬВЯЗДА» па Менску за кастрычнік месяц, з прычыны няправільных адрасоў:

Прозьвішча	Адрас
Грублёўскі	Б. Татарская, 28-2
Арцель Інв. № 13 БСІК	Няміга, 4
Маслоў	Камунальная 42-10, 3-ці паверх
Спэктар А.	Маркаўская, 9
Углянец	Петроўская, 12-1

Просьба да пералічаных падпісчыкаў зьявіцца ў газэтнае бюро (Ленінская вул., будынак пошты, тэл. 2-49) для паказаньня правільнага адрасу.

ЗЬВЯЗДА

ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ

НА КЛІШЭ

ШТРЫХОВЫЯ ТОНАВЫЯ СЕТКІ

МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63. 3-ці ПАВЕРХ

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯКАТЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЕТЫ, ЦЭННІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛ